Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок нанпарэлі наспроц тэксту 1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпешныя на 50 проц. даражэй.
Зьнак тарыфу бярэцца 10 проц. цэлогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт	35 к.
За кожны дадатковы	15 „
Бесплатныя і чырвонаармейцы за дакумэнт	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 22 (2210) Чацьвер, 26-га студзеня 1923 г.

Земляўпарадкаваньне працоўных яўрэяў

Кастрычнікавая рэвалюцыя паставіла на вырашэньне надзвычайна вялікія і важныя задачы: зьнішчыць стары парадак, старыя ўзаемаадносіны паміж людзьмі; зьнішчыць усялякае прыгнечаньне эканамічнае, клясавае, нацыянальнае; перабудаваць сьвет на падставах сацыялістычнае сыстэмы гаспадаркі, весьці барацьбу за тое, каб зрабіць усіх роўнымі, вольнымі. Вось сэнс тых задач, якія былі высунуты Кастрычнікавай рэвалюцыяй і якія ўзялася ажыцьцяўляць рабочая кляса, пабудаваўшы Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

СССР будаваўся і будуецца на падставах поўнае роўнасьці, калі ўсе народы, якія ў яго ўваходзяць, карыстаюцца аднолькавымі правамі і аднолькавымі магчымасьцямі для свайго сацыяльнага і нацыянальнага будаўніцтва і адраджэньня.

Капіталістычныя дзяржавы, капіталістычная сыстэма дзяржаўнага кіраўніцтва, галоўным чынам, грунтуецца на прыгнечаньні больш буйнае нацыі, якая складае гэтую дзяржаву, нацыянальных меншасьцяў, якія жывуць на тэрыторыі гэтае дзяржавы. Амаль ва ўсіх капіталістычных дзяржавах нацыянальныя меншасьці складаюць амаль палову ўсяго насельніцтва і ўсё-ж гэта не дае ім права на ўдзел у дзяржаўным будаўніцтве і кіраўніцтве.

На зусім іншай форме пабудаваны СССР і тыя рэспублікі, якія ў склад СССР уваходзяць. У нашай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы ўсе нацыі, якія на нашай тэрыторыі пражываюць, карыстаюцца аднолькавымі правамі, аднолькава бяруць актыўны ўдзел у будаўніцтве нашае сацыялістычнае рэспублікі.

Гэта-ж самае і датычыцца адносна яўрэйскага насельніцтва нашае краіны, якое пры капіталістычным ладзе знаходзілася пад падвойным уціскам: капіталістычнае эксплёатацыі і сваёй нацыянальнай буржуазеі. Толькі камуністычная партыя і савецкая ўлада пановаму падышлі да вырашэньня яўрэйскага пытаньня. Савецкая ўлада задалася мэтаю прыстасаваньня яўрэйскага насельніцтва—«людзей паветра» да вытворчай працы. Сярод тых мерапрыемстваў, якія праводзяцца пад кіраўніцтвам нашае партыі—савецкім урадам, надзяленьне яўрэйскага насельніцтва зямлёю, прыстасаваньне іх да сялянскае гаспадаркі займае адно з важных месцаў. Зьезд яўрэяў-земляробаў, які гэтымі днямі адбыўся ў Менску, з вялікім задаволеньнем мог адзначыць, што гэтае мерапрыемства савецкае ўлады цалкам сябе апраўдала, што мы маем у гэтай справе буйныя дасягненьні і што нашыя мерапрыемствы знаходзяць водгук сярод яўрэйскіх працоўных мас ня толькі Савецкае рэспублікі, але і далёка за межамі СССР.

Яўрэйскае землякарыстаньне набывае яшчэ асаблівае значэньне, бо яўрэі-земляробы з першага году сваёй працы на зямлі павялі сваю гаспадарку ў пераважнасьці на калектыўных або арцельных падставах, г. зн. больш высокімі спосабамі, чымся сельская гаспадарка да гэтага часу вялася акалічнымі, кароннымі земляробамі-сялянамі.

XV зьезд УсеКП(б) і XI зьезд КП(б)Б галоўнай задачай у працы па вёсны высунулі неабходнасьць калектывізацыі раздробленых сялянскіх гаспадарак і мы, дзякуючы спосабам землякарыстаньня, якія ўжываюць новыя земляробы-яўрэі, маем поўную магчымасьць паказаць нашаму сялянству на гэтым вопыце ўсю карыснасьць і неабходнасьць пераводу ўсёй нашай сельскай гаспадаркі на больш высокія формы карыстаньня.

Зьезд яўрэяў-земляробаў паказаў, што новыя земляробы цалкам асвоіліся з тымі задачамі, якія на іх ускладзены. Яўрэй-земляроб ня гледзячы на значныя перашкоды: недахват вопыту, сродкаў, ведаў усё-ж паказаў, што яго пераход на зяклю цалкам супадае з усімі імкненьнямі, якія стагодзьдзямі выказвалі яўрэйскія працоўныя масы. Толькі белагвардзейцы і чорнасоценцы гаварылі, што яўрэй працаваць ня хоча, што ён на зямлю ніколі ня пойдзе. Савецкая ўлада з самага пачатку адхіліла гэтыя беспадстаўныя довады белагвардзейшчыны і яўрэйскія працоўныя масы на практыцы даказалі ўсю нягрунтоўнасьць гэтых закідаў.

З вялікаю прыхільнасьцю яўрэяў-земляробаў спаткала беларускае сялянства. Беларускае сялянства ніколі не адчувала варожасьці да працоўных яўрэяў, гэта яшчэ раз пацьвердзілася зараз пры пераходзе яўрэяў на зямлю і ў тых прывітаньнях ад беларускіх сялян, якія былі на зьезьдзе яўрэяў-земляробаў.

Гэта дае нам поўнае права падкрэсьліць, што і ў далейшым яўрэйская землякарыстаньне дасьць добрыя вынікі. Савецкая ўлада выратавала яўрэйскія працоўныя масы ад поўнага выміраньня і разарэньня. Беларускі селянін дапамагае яўрэю-земляробу ў набыцьці ім неабходных ведаў для пасьпяхоўнага будаўніцтва сваёй сельскай гаспадаркі. Гэта дае нам цьвёрдую надзею, што той шлях, на якому пайшлі працоўныя яўрэі ў СССР, ёсьць верны шлях, які забясьпечвае далейшае развіцьцё посьпеху і дасягненьняў Кастрычнікавае рэвалюцыі і канчатковае зьнішчэньне ўсякага сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечаньня.

Далейшае прадажніцтва ангельскіх рэфармісцкіх лідэраў.

ПАСТАНОВА ГЕНРАДЫ АБ НАЛАДЖАНЬНІ ДАЛЕЙШЫХ НАРАД З ПРАДПРЫЁМЦАМІ.

ЛЁНДАН, 24-I. Адбылося пасяджэньне генэральнае рады ангельскіх прафсаюзаў для абмеркаваньня пытаньня аб перамовах з прадпрыёмцамі наконт „міру ў прамысловасьці". На пасяджэньні ўхвалена рэзалюцыя аб прадоўжаньні перамоў і аб назначэньні спэцыяльнае камісіі для непасрэднага кіраўніцтва імі. Гэтая пастанова ўхвалена пасьля спрэчак, у якіх выявіліся сур'ёзныя супярэчнасьці між большасьцю генэральнае рады і групаю ворагаў прадоўжаньня перамоў. Погляд меншасьці генрады быў выказан у рэзалюцыі, пададзенай Суэльсам і падтрымавай Кукам. Гэтая рэзалюцыя заначала, што перамовы ня трэба праводзіць далей, бо група прадпрыёмцаў пад кіраўніцтвам Монда (ініцыятар наладжанае 12-га студзеня канфэрэнцыі наконт «міру ў прамысловасьці») заявіла, што ўдзельнікі яе не зьяўляюцца прадстаўнікамі якіх-небудзь прадпрыёмчых арганізацый. За рэзалюцыю была пададзена толькі 6 галасоў. Такі-ж лік галасоў быў пададзен і за папраўку Рычардса да рэзалюцыі большасьці; гэтая папраўка мела той самы сэнс, што і рэзалюцыя Суэльса. Рэзалюцыя, ухваленая большасьцю, была пададзена афіцыйна Томасам і падтрымана Бэвіным. У камісію па кіраўніцтву перамовамі, прадугледжаную гэтай рэзалюцыяй, абраны: Бэр Тэрнар, Біль Торп, Томас, Бэвін, Рычардс і Сітрын.

СОТНІ РАБОЧЫХ РЭЗАЛЮЦЫЙ ПРАТЭСТУ ПРОЦІ ПАЛІТЫКІ «МІРУ Ў ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ».—КУК ВОСТРА КРЫТЫКУЕ ВЫСЛУЖНІЦТВА ГЕНРАДАЎЦАЎ ПЕРАД КАПІТАЛАМ.

ЛЁНДАН, 24-I. У гутарцы з карэспандэнтам ТАСС Кук востра крытыкаваў пастанову генэральнае рады прафсаюзаў аб прадаўжаньні перамоў наконт «міру ў прамысловасьці». Кук падкрэсьліваў, што гэтая пастанова накладае абавязацельствы на ангельскі рабочы рух у той час, як прадпрыемцы паранейшаму нічым ня зьвязаны, бо яны заяўляюць, што ўдзельнічаюць у перамовах толькі асабіста, а не ў якасьці прадстаўнікоў прадпрыёмчых арганізацый. Пастанова генэральнае рады зьвязвае прафсаюзы, перашкаджаючы іх баявым выступленьням у той час, як прадпрыёмцы, наадварот, будуць без перашкоды праводзіць далей сваю палітыку скарачэньня заробітку і наступу на ўсе наогул умовы працы.

Далей Кук заявіў, што ён ня спыніць сваёй кампаніі на карысьць скліку надзвычайнага зьезду прафсаюзаў, а таксам будзе дамагацца агласіць стэнаграфічную справаздачу аб наладжанай 12-га студзеня канфэрэнцыі наконт «міру ў прамысловасьці». Водлуг слоў Кука, яму надасланы сотні рэзалюцый пратэсту проці палітыкі генрады; па ўсіх без выключэньня рабочых мітынгах, дзе ён выступаў пасьля наладжанае 12-га студзеня канфэрэнцыі, нават на мітынгах у найбольш адсталых райёнах, таксама ўхваляліся аднадушна рашучыя рэзалюцыі пратэсту проці палітыкі генэральнае рады з ухвалаю пазіцыі Кука.

АНГЕЛЬСКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ.

ЛЁНДАН, 23-1. У Гузістане—на поўдні Пэрсыі—выбухнула паўстаньне мясцовых племяньняў. Яно было арганізавана ангельскімі нафтавікамі пры дапамозе рэакцыйных шэйхаў. Як відаць, ставілася мэта гаснаваньня „не-залежнага Гузістана», які зьяўляў-б адным з ангельскіх уладаньняў у паўночна-заходняй Індыі, дзе Англія адчувае вялікія цяжкасьці пры праведзеньні сваёй імпэрыялістычнай палітыкі.

ГАДАВІНА СЬМЕРЦІ ЛЕНІНА ЗАГРАНІЦАЮ.

ПУБЛІЧНЫЯ МАНІФЭСТАЦЫІ У ГАЛЯНДЫІ.

БЭРЛІН, 24-1. Водлуг паведамленьняў з Амстэрдаму, 4-я гадавіна сьмерці Леніна была адзначана ў большасьці буйных гарадоў Галяндыі публічнымі маніфэстацыямі. У Амстэрдаме ў маніфэстацыі брала ўдзел 1600 чал.

ВЯЛІКІ МІТЫНГ У РЭВЕЛІ.

РЭВЕЛЬ, 24-1. Рабочая партыя арганізавала ў Рэвелі вялікі мітынг з прычыны гадавіны сьмерці Леніна. Прамоўцы пратэставалі проці нядаўнае пастановы зьезду эстонскіх прафсаюзаў аб далучэньні да Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу.

Дзесяць год баярска-жандарскага рэжыму ў Бэсарабіі.

Край разрабаваны.—Эканоміка і культура няшчадна руйнуецца.—Тэрарызаванае ваеншчынай жыхарства даведзена да жабрацтва.

БАЦЬКАЎШЧЫНА БЭСАРАБЦАЎ — САЮЗ САВЕЦКІХ САЦ. РЭСПУБЛІК.

Голас бэсарабскіх эмігрантаў у Вене.

ВЕНА, 24-1. Учора ў зьвязку з дзесяцігодзьдзем акупацыі Бэсарабіі румынамі, у Вене адбыўся сход бэсарабскіх эмігрантаў. Ухваленая адназгодна рэзалюцыя сьцьвярджае, што рэжым самавольства румынскіх імпэрыялістаў прывёў працоўных Бэсарабіі да жабрацтва і да зруйнаваньня эканомікі і культуры краю. Далей у рэзалюцыі залуўляецца, што жыхарства Бэсарабіі не прызнае румынскага захопу, лічыць сваёю бацькаўшчынаю—СССР, а румынскую акупацыю—часоваю, і бачыць адзіны выхад з сучаснага эканамічнага і сацыяльнага заняпаду ў хутчэйшым далучэньні да працоўных СССР.

Сход пастанавіў таксама паслаць прывітальныя тэлеграмы ЦВК СССР і ЦВК аўтаномнае Малдаўскае ССР.

Адозва Ўсесаюзнага т-ва бэсарабцаў.

МАСКВА, 24-1. У зьвязку з надыходзячым 26 студзеня дзесяцігодзьдзем захопу Бэсарабіі Румыніяй, Усесаюзнае Таварыства бэсарабцаў зьвярнулася да ўсіх працоўных СССР з адозвою, у якой гаворыцца: 10 гадоў нашыя браты за Днястром, адарваныя ад Савецкага Саюзу, стогнуць пад цяжкім ярмом румынскага баярска-жандарскага рэжыму. Эканамічнае зруйнаваньне краю дасягнула апошніх межаў. Румынія высасвае з прыгнечанага краю ўсе сокі. Беспрацоўе вялікае, аплата працы вельмі нізкая. Масы сялянства знаходзяцца на мяжы жабрацтва. Нацыянальныя правы ўсіх народаў Бэсарабіі востра зьневажаюцца. Рабочыя і сяляне пазбаўлены самых элемэнтарных палітычных правоў. Усё жыцьцё краю замерла пад пугаю жандараў і катаваньнямі ахранкі.

Рабочыя і сяляне Бэсарабіі адказваюць на гэты рэжым тэрору ростам рэвалюцыйных арганізацый, паўстаньнямі і частымі забастоўкамі. Але працоўныя Бэсарабіі ня маюць магчымасьці скінуць ярмо акупантаў. 40000 жандараў і ахраньнікаў, цэлыя дывізіі і карпусы рэгулярнага войска крывёю і жалезам прыдушаюць усякую спробу рэвалюцыйнага руху. Няхай нашае гарачае спачуваньне тым, хто стогне пад ярмом акупантаў, дакажа рабочым і сялянам захопленае Бэсарабіі, што рабочыя і сяляне СССР таксама, як і яны, ня спыняюць лічыць Бэсарабію часткаю Савецкага Саюзу, толькі часова і гвалтоўна адарваную ад яго.

Няхай нашае гарачае прывітаньне барацьбітом за вызваленьне Бэсарабіі падасьць бадзёрасьці для далейшае барацьбы проці захопнікаў і гвалтаўнікоў.

Адзін з узораў разрабаваньня вёскі.

ВЕНА, 18-1. З Румыніі паведамляюць, што ў Кішынёўскім вайсковым судзе разглядалася нядаўна справа 17 вайсковых, абвінавачваемых у рабунках, каятрабандзе і бандытызьме. Сярод абвінавачваемых 3 афіцэры, некалькі унтэр-афіцэраў і салдаты. Справа была распачата яшчэ ў 1923 г. і некалькі разоў адкладалася. Цяпер яна таксама адкладзена на няпэўны час.

Гісторыя працэсу, апісаная ва «Унівэрсуле», яскрава выкрывае становішча ў Бэсарабіі. У 1921-22 г. кавалерыйскі эскадрон пад камандай капітана Романо быў размешчаны ў бэсарабскім мястэчку Пятрося-Бік. Судозае сьледзтва выкрыла, што салдаты эскадрону з ведама і пры падтрыманьні сваіх камандзіраў тэрарызавалі ўсё ваколічнае жыхарства, рабуючы на дарогах, нападаючы на сялян і адбіраючы ў іх усё. Рабункі рабіліся сыстэматычна і зусім бяскарна, бо здобыч «разьмяркоўваўся па братэрскі» між салдатамі і іх начальнікамі.

Апрача ўдзелу ў рабунках, капітан Романо абвінавачваецца яшчэ ў шматлікіх цяжкіх злачынствах. Ён пры дапамозе зброі прымушаў сялян прадаваць яму хлеб па танных цэнах, заяўляючы, што ён патрэбны яму для эскадрону, і перапрадаваў потым яго па дарагіх цэнах прыватным асобам. Усё гэта рабілася тады, калі ў Бэсарабіі лютаваў голад.

Вайна між Уханам і Нанкінам.

ТОКІЁ, 24-1. Паведамленьне аб барацьбе між уханскім войскам (войска Вай-Цзун-Чы) і хунаньскім (быўшае войска Тан-Шэн-Чы), якое перайшло на бок Чан-Кай-шы, вельмі супярэчлівыя. Аднак, апошняе паведамленьне агенцтва Сімбун Рэнго з Чанша (правінцыя Хунань) кажа, што хунаньскае войска пацярпела рашучае паражэньне ля Ціньцьзяну (за 60 кілёмэтраў на паўночны ўсход ад Чанша) і адступае на захад да Хенчжоу і Чандэ. Захоп Чанша ўханскім войскам чакаецца 24-га студзеня.

ПЕРАДВЫБАРЧЫ ТЭРОР ПІЛСУДЧЫНЫ.

АРЫШТЫ Ў ВАРШАВЕ.

ВАРШАВА, 24-1. Апошнімі днямі арыштавана 76 чалавек, большасьць якіх абвінавачваецца ў распаўсюджаньні перадвыбарчых камуністычных лістовак, расклейваньні плякатаў і г. д.

РАЗГОН РАБОЧЫХ МІТЫНГАЎ.

ВАРШАВА, 24-1. У Лодзі разагнаны мітынг, наладжаны левым крылом ППС. Удзельнікі мітынгу аказвалі паліцыі адпор. Шмат арыштавана.

У Павонсках (рабочы райён Варшавы) адбыўся шэраг лятучых рабочых мітынгаў пад адкрытым небам. Паліцыя разагнала мітынгі і ўчыніла шмат арыштаў.

Шапель выпушчан.

Б. пасол сойму п. Шапель, якога арыштавалі гэтымі днямі ў Варшаве, выпушчан ужо на волю.

Адозва ЦК блёку нацменшасьцяў.

ЦК выбарнага блёку нацменшасьцяў у Польшчы выдаў адозву, у якой успамінае гісторыю ўзьнікнаваньня блёку ў 1922 г. і сьцьвярджае, што палажэньне нацменшасьцяў у Польшчы ад таго часу не палепшылася; нацуючая польская большасьць, якая лічыць сябе грамадзянамі 1-га разраду, аднеслася вельмі варожа да ідэі ўзнаўленьня блёку, прызнаючы гэта права толькі за сабою, а не за грамадзянамі 2-га разраду, якімі зьяўляюцца нацменшасьці Польшчы.

Беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам.

„Глос Правды" і іншыя савецкія газэты апублікавалі гэтымі днямі маніфэст „Беспарт. Блёку супрацоўніцтва з урадам", у якім заклікаюць усіх галасаваць за ўрадавы сьпісак. Уся польская прэса, за выключэньнем каэбінай, сустрэла гэты маніфэст насьмешкамі і пытаецца аб праграме гэтага беспраграмнага блёку.

СПРАВА СЯМІ КАМУНІСТАЎ.

27 студзеня г. г. у Слоніме пачнецца працэс 7 камуністаў, абвінавачаных у антыдзяржаўнай дзейнасьці на абшары Слонімскага павету.

Усе абвінавачаныя будуць адказваць па 102 арт. К. К.

Перад судом стануць: М. Агушэвіч, Л. Амельянчык, І. Агушавіч, Ф. Кавалеўскі, Д. Гарасік, Купнік і Троцік.

Уручэньне акту абвінавачаньня.

Гэтымі днямі беластоцкі акруговы суд уручыў акты абвінавачаньня членам ЦК кампартыі Зах. Беларусі, а таксама членам Беластоцкага акр. кам. КПЗБ.

Сярод 133 абвінавачаных два: Якуб Чэрнік і Станіслаў Мэргенс у часе апошняга абмену палітвязьнямі прыехалі ў СССР.

ФАШЫСЦКАЯ ПРАГРАМА НОВАГА ЛАТВІЙСКАГА ЎРАДУ.

РЫГА, 23-1. «Сацыял Дэмакратс» лічыць, што фактычнае кіраўніцтва новым урадам Юрашэўскага будзе належаць расейскаму манархісту арцыбіскупу Яну, фашысцкаму лідэру Бэргу, Дубіну і Айбэрынгу, але не дэмакратычнаму цэнтру. Газэта падкрэсьлівае, што дэмакратычны цэнтр пад націскам правых адмовіўся амаль ад усіх сваіх першапачатковых патрабаваньняў.

ШТО ВЫКРЫЎ САН-ГАТАРДЗКІ ІНЦЫДЭНТ.

ТАЙНАЯ ВАЕННАЯ СУВЯЗЬ МІЖ ІТАЛІЯЙ І ВЭНГРЫЯЙ З ДАЗВОЛУ ЛІГІ НАЦЫЙ.—ФРАНЦУСКАЯ ПРЭСА БЬЕ ТРЫВОГУ.

ПАРЫЖ, 24-I. «Эко-дэ-Пары» піша, што магутныя сілы імкнуцца перашкодзіць расьсьледаваньню сан-гатардзкага інцыдэнту, і што існуе маўклівая згода, водлуг якое Ліга Нацый ў гэтым выпадку не павінна выкарыстаць сваё права расьсьледаваньня. Па думцы «Волёнтэ», сан-гатардзкі інцыдэнт даваляе лічыць, што між Італіяй і Вэнгрыяй існуе ваенная сувязь, і што адмова ад расьсьледаваньня раўнамоцна стварэньню прэцэдэнта, які можа прывесьці да зьнішчэньня вайсковага кантролю і над Нямеччынаю. Газэта патрабуе, каб Францыя падтрымала ініцыятыву Малое Антанты, якая дамагаецца расьсьледаваньня.

Водлуг паведамленьня «Інфармасьён», Нямеччына, Італія і Англія аказваюць моцны нажым на дзяржавы Малое Антанты, каб прымусіць іх адмовіцца ад намеру патрабаваць умешваньня Лігі Нацый.

Савецкая нафта на румынскім рынку.

ВЕНА, 16-1. Бухарэсцкая «Лупта» прысьвечвае вялікі артыкул пад загалоўкам—«Небясьпека для румынскае нафтавае прамысловасьці» пытаньню аб канкурэнцыі савецкае нафты. Водлуг думкі газэты, румынскім нафтавым прадпрыёмствам трэба аб'яднацца, бо ў іншым разе савецкая нафта канчаткова выпхне румынскую з сусьветнага рынку.

У ЛІТВЕ.

Напярэдадні камуністычнага працэсу.

КОЎНЯ, 18-1. Дазнаньне па справе камуністычных арганізацый скончана і перададзена пракурору ваеннага суду. З ліку 19-ці арыштаваных вызвалены прафэсар Бурак і яшчэ трое, арыштаваныя разам з ім.

Канфіскацыя сіяніцкае бібліятэкі з „камуністычнай літаратурай".

КОЎНЯ, 24-1. Літоўскія газэты паведамляюць, што ўлада канфіскавала бібліятэку з «камуністычнаю літаратураю». Бібліятэка належала партыі Поалей Цыён (яўрэйская рабочая партыя, якая далучаецца да сыяністаў).

Ангельская карная экспэдыцыя ў Судане.

ЛЁНДАН, 18-1. Ангельскія паветраныя сілы надаўна распачалі карную экспэдыцыю проці племя нуер-нуонг у паўдзённым Судане. Прычынаю для карнае экспэдыцыі было забойства ангельскага акруговага камісара капітана Фэргусона.

У Саюзе ССР.

На хлебазагатоўчым фронце.

ДАЛЕЙШАЕ ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ.

ВЯТКА, 24-1. 4 я пяцідзёўка студзеня дала далейшае павялічэньне хлебных загатовак. Усяго за пяцідзёўку загатавана 5.600 канцэрнаў, што ў два разы перавышае загатоўкі папярэдняе пяцідзёўкі.

*

САМАРА, 24-1. У студзені загатавана 542.000 пуд. хлеба, у тым ліку 325.000 за апошнюю пяцідзёўку, што паказвае моцны ўздым у загатоўках.

ПЕНЗА, 24-1. За 4-ю пяцідзёўку студзеня ўсяго ў губэрні загатавана хлеба ўсіх культур 247.700 пуд. Першая пяцідзёўка дала толькі 53.600, трэцяя—107600.

ДЭЗАРГАНІЗАТАРАМ ХЛЕБАЗАГАТОВАК АСТРОГ.

АРЦЁМАЎСК, 24-1. Нарсуд прысудзіў буйнага гандляра хлебам Сьпівакава за дэзарганізацыю хлебазагатовак і зрыў хлебазагатоўчых цэн да зьняволеньня на 1 год, з канфіскацыяю маёмасьці на 1500 руб. і высылкаю з Украіны на 5 гадоў.

ПАЗЫКА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЯЛЯНСКАЕ ГАСПАДАРКІ.

Ход рэалізацыі.

ЦЬВЕР, 24-1. Сход пайшчыкаў Ітомільскага сельска-гаспадарчага т-ва Грымінскае волясьці пастанавіў кожнаму пайшчыку набыць 10-ці рублёвую аблігацыю пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі.

* * *

ВОЛАГДА, 24-1. У трох валасьцях Валагодзкага павету селькоры першыя набылі пазыку, выклікаўшы праз мясцовую газэту сялян, з якіх каля сотні адгукнулася і купіла аблігацыі пазыкі. Усяго па выліках куплена аблігацый на 1.000 руб.

Выгавар за нядбайнасьць у распаўсюджаньні пазыкі.

МАСКВА, 24-I. За нядбайныя адносіны да абавязкаў, якія выявіліся ў затрыманьні ў кладовай Дзяржбанку дастаўленых 10-га студзеня сьпешнак поштаю з Масквы часовых пасьведчаньняў пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі—кіраўніку башкірскае канторы дзяржбанку Яфімаву і яго намесьніку Айбулатаву башкірскім абласным камітэтам УсеКП(б) абвешчан суровы выгавар, з папярэджаньнем выключэньня з партыі.

ПРЫКЛАД ІНШЫМ.

АРАНБУРГ, 25-1. У Ілецку селяніна Крывіцкі першым здаў 25 пудоў хлеба і ўзяў аблігацыі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі. Селянін Рахматулін здаў 700 пудоў проса, Папоў—13 п., Філатаў—100 п., Мяняйлаў—25 п. Усе яны набылі аблігацыі.

НА ЎЗМАЦНЕНЬНЕ АБАРОНЫ.

МАСКВА, 24-1. У дні сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя Чырвонае арміі ў Маскве на цэнтральным аэрадроме адбудзецца ўрачыстая перадача чырвонаму паветранаму флёту некалькіх дзесяткаў самалётаў. Самалёты гэтыя пабудаваны на сродкі, сабраныя дабрахвотным шэлхам працоўнымі. Да дню 10-годзьдзя Чырвонае арміі ў Маскве адкыняецца інстытут процігазавае абароны. Інстытут прыняце вялікую карысьць у справе падрыхтоўкі жыхарства да хімічнае абароны.

Тав. Шкіратаў—сэкратар парткалегіі ЦКК.

МАСКВА, 24-I. З прычыны назначэньня Янсана наркомам юстыцыі РСФСР, прэзыдыум ЦКК УсеКП(б) пастанавіў вызваліць яго ад абавязкаў сэкратара партыйнае калегіі ЦКК УсеКП(б) і зацьвердзіць сэкратаром партыйнае калегіі Шкіратава.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

ЛЁКАУТ У СЯРЭДНЯ-НЯМЕЦКАЙ МЭТАЛЁПРАМЫСЛОВАСЬЦІ АЖЫЦЬЦЁЎЛЕН.

БЭРЛІН, 25-1. Абвешчаны на 24-ае студзеня лёкаут у сярэдня-нямецкай мэталёпрамысловасьці, за адзіночнымі выключэньнямі, ажыцьцёўлен. Лёкаут толькі падняў баявы настрой мэталёўцаў. Рэфармісцкія правадыры прафсаюзаў працягваюць траўлю камуністычнай партыі і левай прафсаюзнай меншасьці.

НОВАЯ РУМЫНСКАЯ НОТКА ПА КАМЭРТОНУ З АНГЛІІ.

БАЛТА, 25-1. Старшыня СНК Аўтаномнай Малдаўскай ССР т. Стары ў гутарцы з карэспандэнтам Ратау заявіў:

«Румынская буржуазея рыхтуецца к сьвяткаваньню 10-цігодзьдзя «дабрахвотнага» далучэньня Бэсарабіі к Румыніі і разам з гэтым узмацняе і без таго нявыносны рэжым у Бэсарабіі. Весткі аб жыцьці і творчасьці маладой Малдаўскай рэспублікі пашыраюцца ўсёй глыбей у Бэсарабію. Румынскі буржуазны друк раней сьцьвярджаў, што ў АМССР няма малдаван, а цяпер ён сьцьвярджае, што ў АМССР і нават за яе межамі іх маецца шмат мільёнаў. Румынскі друк узмацнена загаварыў аб неабходнасьці аб'яднаньня «братоў» малдаван. Новая нота, бязумоўна, узята на камэртону з Англіі. Мы, разумеецца, ня супроць аб'яднаньня. Але яны за аб'яднаньне наўкол румынскага караля, а мы за аб'яднаньне наўкол Чырвонага сьцягу».

За дзень.

Барацьба нямецкага пралетарыяту.

Баявы рух рабочае клясы Нямеччыны разрастаецца. Тэкстыльшчыкі і табачнікі, мэталісты і гарнякі не жадаюць больш адступаць перад наступам капіталу, не падаюцца больш на хітравумныя размовы рэфармістаў, не згаджаюцца больш цярпець цяжкі ўціск эксплёатацыі. Пралетарыят Нямеччыны з кожным днём усё больш рашуча і цьвёрда пераходзіць на шлях клясавае барацьбы і з яго наступам прымушаны лічыцца і рэфармісты і нямецкі ўрад.

Найбольш яскравым прыкладам гэтага націску мас зьяўляецца забастоўка мэталістаў у сярэдзіне Нямеччыны. Яна выбухла наміма волі і наміма імкненьняў прафсаюзнае бюракратыі, якая адразу пасьля абвешчаньня забастоўкі пачала захады да спыненьня забастоўкі. Нічога з гэтага ня вышла і рэфармісты не змаглі выканаць даручаны ім акт здрады капіталістамі.

Другім прыкладам уздыму нямецкіх пралетарскіх мас зьяўляецца толькі што скончыўшая сваю працу канфэрэнцыя гарнякоў Рурскае вобласьці. Настрой дэлегатаў быў настолькі баявы, што нават вялікі майстар меншавіцкіх фокусаў старшыня саюзу гарнякоў Гузоман прымушан быў згадзіцца, каб прапановы левае меншасьці былі ўключаны ў рэзалюцыю па яго дакладу. Гэтыя прапановы гавораць аб падрыхтоўцы да новае і рашучае барацьбы.

Гэткія-ж самыя зьявы адбываюцца і ў Вэстфальскай правінцыі і ў цэлым шэрагу іншых правінцый. Рабочая кляса Нямеччына ўступае ў новы перыяд рашучай клясавай барацьбы, і ніякія меншавікі ня могуць гэты рух спыніць.

Правая Латвія.

Пасьля паўтарамесячнага крызісу латвійскага ўраду,—крызісу, які паказаў поўную нездольнасьць сучаснага латвійскага сойму ўтварыць моцны парлямантарны ўрад, які апіраўся-б на пэўную спаяную большасьць,—новы „парлямантарны" ўрад Латвіі ўрэшце склеен.

«Дэмакратычны цэнтр» — партыя, якая налічвае ў латвійскім сойме толькі некалькі дэпутатаў і якая толькі ў такіх выключных умовах, як цяпер у Латвіі, дзе ні правіца, ні лявіца ня маюць большасьці ў сойме, раптам усплыла на шырокія прасторы дзяржаўнай палітыкі, тады, як не доляй было баўтацца ў проламцы, як той трэсцы.

Новы ўрад склеен... У склад яго ўвайшлі ўсе правыя групы латвійскага сойму, г. ё. тыя групы, якія заядла атакавалі папярэдні латвійскі ўрад за тое, што ён заключыў з намі ўмову аб ненападзе і гандлёвую ўмову.

Можна чакаць, што новы латвійскі ўрад Юрашэўскіса спрабуе зьліквідаваць працу папярэдняга ўраду і пасаваць наладжаныя з намі адносіны, а разам з тым запрадаць інтарэсы Латвіі сусьветнаму капіталу, а ў першую чаргу Англіі, Польшчы і інш.

«Сацыял-Дэмакратс»—орган латвійскай сацыял-дэмакратыі—лічыць, што «фактычнае кіраўніцтва новым урадам Юрашэўскіса будзе належаць расейскаму манархісту архіепіскапу Івану, фашыстаўскаму лідэру Бэргу, Дубіну і Айбэрынгу, але не дэмакратычнаму цэнтру". Газэта падкрэсьлівае, што дэмакратычны цэнтр пад націскам правых адмовіўся амаль ні ад усіх сваіх папярэдніх вымаганьняў.

З другога боку—мы маем засьведчаньне, якое Юрашэўскіс удзяліў на гатых днях латвійскаму друку. Ён сказаў, што «жаданьнем яго ўраду будзе правядзеньне такой палітыкі, якая-б запэўніла краю спакой, а людзьмі дабрабыт».

Усякі зразумее, што гэтыя словы нічога ня значаць, бо кожны можа разумець іх як хоча. Відаць што п. Юрашэўскісу інакш казаць ня можна і ня прыдзецца, бо яго «парлямантарны» урад зьяўляецца штучна склееным канглямэратам элемэнтаў, якія змагаюцца з самімі сабою.

Такі правы ўрад не патрэбен Латвіі, якая на свайму сацыяльнаму складу ня можа быць правай. Гэта—нейкая недарэчнасьць!

Аб чым марыць Пілсудчына.

Бязупынныя клопаты аб міру, якія штодзень выказваюцца працоўнымі масамі нашае рэспублікі, прымушаюць нас вельмі ўважліва прыслухоўвацца да таго, што гаворыцца на тым боку нашае мяжы, адкуль можа выбухнуць вайна.

У гэтых адносінах на асаблівым падазрэньні ў нас знаходзіцца валынічы лягер польскае Пілсудчыны. Наколькі падстаўна нашае падазрэньне яшчэ раз гэтымі днямі пацьвердзіла выступленьне аднаго з саратнікаў Пілсудзкага нейкага Эвэрта. Гэты суб'ект-рэдактар органу польскага вайсковага міністэрства і зусім зразумела вельмі добра ведае ваенныя тайны Пілсудчыны, гэтымі днямі на банкеце афіцэраў запасу ў Варшаве сказаў наступнае:

«Польшчы патрэбна крывавая вайна, у якой бралі-б удзел і пралівалі сваю кроў сотні тысяч чалавек, толькі тады народныя масы Польшчы як сьлед зразумеюць значэньне ўласнае самастойнае дзяржавы».

Далёка невыпадкова ў гэтага падвыпіўшага салдафона сарваліся падобныя словы. Недарма прыказка кажа, што «ў цьвярозага на розуме, то ў п'янага на языку». Тое, аб чым гавор

ЯЎРЭЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ У КРАІНЕ САВЕТАЎ.

(З дакладу тав. Чарвякова на усебеларускім зьезьдзе сялян-яўрэяў).

Сутнасьць яўрэйскага пытаньня вынікае з тых асаблівасьцяў, у якіх знаходзіцца яўрэйскае насельніцтва буржуазных краін: яўрэі, як вядома, складаюць ва ўсіх дзяржавах меншасьць насельніцтва, нідзе ня маюць большасьці. Становішча яўрэйскага насельніцтва, такім чынам, вызначаецца ў першую чаргу цэлым шэрагам абмежаваньняў у правах з боку нацыянальнай большасьці, на карысьць дзяржаўнай нацыі кожнай буржуазнай дзяржавы. Прыняўшы-ж пад увагу, што кожная буржуазная дзяржава зьяўляецца камітэтам па справах пануючай буржуазеі, зразумела, што як і ўсякая нацыянальная меншасьць, яўрэйскае насельніцтва, у тым ліку і яўрэйская буржуазея, абмяжованы ў правах, каб забясьпечыць верхаводзтва пануючай буржуазеі.

Аднак, становішча яўрэйскага насельніцтва пагаршаецца яшчэ наступнымі прычынамі: першае—гэта тое, што нідзе няма яўрэйскай дзяржавы, якая-б магла выступіць на абарону правоў яўрэйскай нацменшасьці. Мы добра ведаем, што асноваю кожнае буржуазнае дзяржавы зьяўляецца прыгнечаньне слабейшага мацнейшым і што буржуазныя дзяржавы лічацца толькі з сілаю.

Сыстэма капіталістычных дзяржаў пабудавана так, што ў кожнай буржуазнай дзяржаве наглядаецца прыгнечаньне нацменшасьцяў, а ў той-жа час гэта самая буржуазная дзяржава выступае ў якасьці абаронцы правоў нацменшасьці ў другой дзяржаве, калі гэта нацменшасьць зьяўляецца нацбольшасьцю ў першай дзяржаве. Напрыклад, Польшча прыгнятае ўсе нацыянальныя меншасьці ў Польшчы, а ў той-жа час выступае на абарону правоў палякаў у Літве, Румыніі і г. д. Таксама Літва прыгнятае палякаў у Літве, а сама выступае ў якасьці абаронцы літоўскай нацменшасьці ў Польшчы і г. д. і г. д. Праз такую «абарону» правоў нацменшасьці ў другой дзяржаве кожная буржуазная краіна імкнецца дабіцца і ўмацаваць уплывы на справы другой дзяржавы.

Зразумелая рэч, што калі кожная буржуазная дзяржава прыгнятала нацыянальныя меншасьці, то яна заўсёды аглядвалася, хто стаіць за сьпіной гэтай нацменшасьці. Вось чаму прыгнечаньне яўрэйскага насельніцтва часта пераходзіла граніцы ўсялякіх чалавечых магчымасьцяў: бо за правы яўрэяў ня было каму ўступіцца ўзброенай сілай.

Другая прычына пагоршаньня становішча яўрэйскага насельніцтва ў тым, што капітал яўрэйскай буржуазеі заўсёды зьяўляўся небясьпечным канкурэнтам для пануючай буржуазеі. Чым большая была небясьпека з гэтага боку, тым больш пануючая буржуазея старалася сілаю абмежаваць правы яўрэйскага народу, баючыся, што эканамічная перамога яўрэйскай буржуазеі прывядзе да палітычнай яе перамогі. Асабліва востра гэта адчувалася ў старой Расеі, а цяпер адчуваецца ў Польшчы, Літве, Румыніі.

Падыходзячы да яўрэйскага пытаньня з боку клясавых суадносін, мы бачым, што калі яўрэйскай буржуазеі прыходзілася дабівацца роўных правоў з пануючай буржуазеяй, то яўрэйскай беднаце, працоўнаму яўрэйскаму народу прыходзілася пераносіць падвойны ўціск і вясьці падвойную барацьбу: з аднаго боку, яўрэйская беднота была прыгнечана агульным абмежаваньнем яўрэяў у правах, а з другога боку—знаходзілася пад уціскам сваёй буржуазеі, якая пад выглядам агульнасьці яўрэйскіх інтарэсаў імкнулася ўтрымаць сваё панаваньне над яўрэйскай беднатой.

ВЫРАШЭНЬНЕ ЯЎРЭЙСКАГА ПЫТАНЬНЯ У КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ ДЗЯРЖАВАХ.

Наш кароткі аналіз дае магчымасьць разабраць, якім-жа шляхам можа быць вырашана яўрэйскае пытаньне.

У сучасны момант зусім выразна вызначаліся два шляхі вырашэньня яўрэйскага пытаньня: буржуазны і пралетарскі.

Буржуазны шлях вырашэньня яўрэйскага пытаньня пабудован на захаваньні існуючых буржуазных эканамічных, праўных і клясавых узаемаадносін і дабіваецца рознымі мэтадамі роўнасьці для яўрэйскага народу, што трэба разумець: роўнасьці для буржуазеі і падняволенага становішча для працоўных.

Усе разнастайныя спосабы буржуазнага вырашэньня пытаньня можна прывесьці да трох асноўных: асіміляцыя, дамаганьне нацыянальна-культурнай аўтаноміі і сіяніізм, або барацьба за ўтварэньне яўрэйскай дзяржавы ў Палестыне.

Калі мы гаворым аб асіміляцыі, то нам ня трэба зьмешваць паступовага зьнішчэньня нацыянальных супярэчнасьцяў, як няўхільнага, гістарычнага працэсу з практыкай асіміляцыі яўрэйскай буржуазеі.

Мы ня можам гаварыць аб тэорыі асіміляцыі яўрэйскай буржуазеі. Там тэорыя была вельмі простая і вынікала яна з вузка-практычных мэтаў—дабіцца роўнасьці для яўрэйскай буржуазеі з пануючай буржуазеяй.

Тут-жа трэба адзначыць, што асіміляцыя вельмі мала кранулася яўрэйскай беднаты, якая толькі такім чынам захоўвае асаблівасьці яўрэйскага быту, культуры і інш.

Дамаганьні нацыянальна-культурнай аўтаноміі, барацьба за агульна-яўрэйскія інтарэсы ў межах буржуазнай дзяржавы—есьць другі спосаб буржуазнага вырашэньня яўрэйскага пытаньня. «Аспоўны прынцыповы грэх гэтай праграмы», кажа У. І. Ленін, «той, што яна імкнецца правесьці ў жыцьцё самы ўдасконалены і самы абсалютны да канца дазволены нацыяналізм. Сэнс гэтае праграмы: кожны грамадзянін запісваецца ў якую-колеча нацыю, і кожная нацыя складае юрыдычнае цэлае з правам прымусовага ападаткаваньня сваіх сяброў, з нацыянальнымі парляментамі (соймамі), з нацыянальнымі статс-сэкратарамі (міністрамі)». У чым сэнс пытаньня аб нацыянальнай культурнай аўтаноміі для яўрэяў? Калі немагчыма, нават шляхам асіміляцыі, дабіцца роўнасьці ў тэй ці іншай дзяржаве, то трэба дамагацца права на панаваньне хаця-б у межах свайго народу, трэба стварыць дзяржаву ў дзяржаве, трэба дабіцца манаполіі для яўрэйскай буржуазеі на панаваньне над яўрэйскай беднатой. Каму гэта дае карысьць? Ці дае гэта шлях надзеі на выхад з яўрэйскага «гетто»? Ці можа ён зьнішчыць усё тое, што робіць зусім немагчымым далейшае існаваньне яўрэйскай беспрацоўнай, прыгнечанай і эксплёатуемай беднаты? Відаць, што не. Шлях нацыянальна-культурнае аўтаноміі дае толькі манаполію яўрэйскай буржуазеі на панаваньне над яўрэйскай беднатой, даводзячы адмоўныя бакі нацыяналізму да свайго лёгічнага канца.

«Сіяніізм імкнецца ўтварыць для яўрэйскага народу «правоохранное убежище в Палестине», так гаворыць Базэльская праграма сіяністаў. Аспоўны сэнс і падставы гэтага характэрнага яўрэйскага пытаньня праграмы тыя, што і двох папярэдніх.

Справа тут для яўрэйскай буржуазеі не ў Палестыне. Палестына—гэта толькі сродак. Гэтым шляхам яўрэйская буржуазея імкнецца дабіцца сабе роўных правоў там, дзе знаходзіцца яе багацьці, бо гэтых багацьцяў яўрэйская буржуазея і ня думае пераносіць у Палестыну. Падыход да гэтай справы такі: калі тыя нацыянальныя меншасьці, што маюць свой «фатэрланд» з нацбольшасьцю сваёй нацыянальнасьці лепш абараняюць свае правы, то, утварыўшы сваю нацыянальную дзяржаву, яўрэйскі народ зможа лепш абараняць свае правы. Гэту праграму яўрэйскай буржуазеі падтрымала ангельская буржуазея, якая дзеля таго, каб замацаваць свае ўплывы на ўсходзе, дабілася мандату на кіраваньне Палестынай і дапамагае яўрэйскай буржуазеі будаваць у Палестыне нешта накшталт яўрэйскай дзяржавы. А што гэта дае яўрэйскай беднаце? Ды нічога. Папершае, беднату ў Палестыну ніхто ня кліча, падругое—у Палестыне, як і ў кожнай буржуазнай дзяржаве яўрэйская буржуазея садзіць яўрэйскіх рабочых у турмы.

Бачым, што і гэта тэорыя ставіць сваёй мэтай інтарэсы буржуазеі, хаця і прыкрывае іх, як і звычайна, агульна-нацыянальнымі інтарэсамі.

Ня дзіва, што нават чорнасоценныя зубры, як вядомы Зубатаў, не баяліся сіяністу, а стараліся выкарыстаць яго супроць яўрэйскіх рэвалюцыянэраў.

ЯЎРЭЙСКАЕ ПЫТАНЬНЕ ВА УМОВАХ САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ.

Як-жа ставіцца яўрэйскае пытаньне ва ўмовах савецкай дзяржавы? Мне здаецца было-б надзвычайнаю памылкаю пачынаць вырашэньне яўрэйскага пытаньня так, як гэта пачынаюць некаторыя таварышы, калі на першы плян ставяць пытаньне аб тым—ці зьяўляецца яўрэйства нацыяй, ці не зьяўляецца нацыяй? Часта, замест таго, каб вывучыць дасканала становішча яўрэйскага насельніцтва, яго асаблівасьці, яго эканоміку, яго быт, замест таго, каб выпрацаваць тыя канкрэтныя задачы, на падставе якіх мы зможам ня толькі на словах, але і на справе даць роўнасьць яўрэйскай беднаце праз зьнішчэньне беднасьці, некультурнасьці, выводзячы яўрэйства з яўрэйскага „гетто", высоўваецца пытаньне аб тым,—ці зьяўляецца яўрэйства нацыяй, ці не зьяўляецца і гэтым пытаньнем засланяюць усе іншыя пытаньні.

Намойму гэтае пытаньне—есьць пытаньне схалястычнае, гэта есьць фармальны момант, таксама як ва ўмовах савецкай дзяржавы, фармальным зьяўляецца пытаньне аб дзяржаве.

Буржуазная навука даказвае, што дзяржава есьць надклясавая арганізацыя дзеля рэгуляваньня ўзаемаадносін паміж клясамі—гэта есьць тэорыя. Практыка-ж буржуазнай дзяржаўнасьці гаворыць, што дзяржава—гэта есьць арганізацыя для прыгнечаньня слабейшага мацнейшым. Вось чаму ва ўмовах буржуазнай дзяржаўнасьці пытаньне аб нацыі мае выключнае значэньне. Прызнаньне, ці непрызнаньне народа «нацыяй» вызначае правы гэтага народу на дзяржаўнасьць, на ўтварэньне ў тэй ці іншай форме нацыянальнай дзяржавы, гэта значыць арганізацыі, якая-б паставіла буржуазею данай нацыянальнасьці ў пануючае становішча.

Так мы бачым, што ў пытаньні аб тым, ці зьяўляецца тэй ці іншы народ нацыяй цікавіць галоўным чынам буржуазею і ёю ставіцца.

Наша пралетарская навука і практыка аб дзяржаве гаворыць, што кожная дзяржава ёсьць арганізацыя дзеля прыгнечаньня: буржуазная дзяржава служыць для прыгнечаньня большасьці эксплёатуемых меншасьцю эксплёататараў-капіталістаў, і ставіць сваёй мэтай увекавечаньне буржуазнага парадку жыцьця; пралетарская Савецкая дзяржава служыць дзеля прыгнечаньня меншасьці капіталістаў большасьцю працоўных, якія ўзялі ў свае рукі ўладу, каб перабудаваць сьвет на сацыялістычных падставах, зьнішчыць усялякае прыгнечаньне, а ў тым ліку і струмант прыгнечаньня — дзяржаву. Значыцца, для нас дзяржава — гэта сродак, які мае часовае значэньне. Адсюль відаць, што і пытаньне аб нацыі ў нас ня можа ставіцца так, як яно ставіцца ва ўмовах буржуазнага грамадзтва.

Ва ўмовах Савецкай дзяржавы, пасьля Кастрычніка, мы ня можам пачынаць вырашэньне яўрэйскай праблемы пастаноўкай пытаньня, ці зьяўляецца яўрэйства нацыяй, ці не? Мне здаецца, што ня гэта непакоіць у сучасны момант яўрэйскую беднату, саматужніка, рамесьніка, новага селяніна-земляроба ці дробнага гандляра. У сучасны момант непакоіць яўрэя тое,—ці хутка ён выйдзе з таго цяжкага эканамічнага і культурнага становішча, у якім ён знаходзіўся ў час існаваньня буржуазнай Расеі, у якім ён апынуўся пасьля імпэрыялістычнай вайны.

І, вось, выходзячы з гэтага, таварышы, мы ва ўмовах Беларусі і наогул у Савецкім Саюзе пачалі вырашаць яўрэйскае пытаньне практычна. Мы паставілі мэтай дабіцца таго, каб на справе зрабіць яўрэя вольным, зрабіць яўрэя роўным, даць магчымасьць яўрэю прыняць актыўны і роўны ўдзел у барацьбе за новае сацыялістычнае будаўніцтва. (Воплескі).

РАЎНАПРАЎЕ ПОЛЬСКІХ ЯЎРЭЯЎ.

Паглядзім як вырашаецца яўрэйскае пытаньне ў Польшчы, дзе яўрэяў налічваецца каля 3.000.000 чалавек.

У часопісу „Націо" аб яўрэйскім школьніцтве гаворыцца наступнае: „дзяржаўных яўрэйскіх школ няма, усе пачатковыя школы з старажытнай яўрэйскай або яўрэйскай мовай выкладаньня—усе прыватныя... Яўрэйскія пачатковыя школы ня маюць ніякіх правоў і не атрымоўваюць ніякіх субсыдый ад ураду... Настаўнікі пачатковых яўрэйскіх школ пры выконваньні вайсковай службы не карыстаюцца тымі льготамі, якія маюць настаўнікі ўрадавых школ. Яўрэйскіх настаўнікаў забіраюць у войска ў працягу школьнага году, ня лічачыся з тым, якую гэта робіць шкоду для школы". (Націо, № 3-4, 1927 г. стар. 74, 76, 78).

У польскіх сярэдніх школах лік яўрэяў не перавышае 6 проц. у той час, як у царскія часы ён складаў 10 проц., а ў жаночых гімназіях нават 15 проц. Аб вышэйшай школе мы маем наступную даведку: 30 мая 1927 году яўрэйскі дэпутат Грынбаум падаў польскаму міністру асьветы і вызнаньняў меморыял аб тым, што для яўрэяў існуе „процантная норма".

„Кожны год,—гаворыцца ў меморыяле,—яўрэйскія дэпутаты прымушаны бываюць зварочвацца да пана міністра асьветы і вызнаньняў з запытаньнем аб тым, што пры прыёме яўрэяў у вышэйшыя школы ў Польшчы робіцца адмежаваньне студэнтаў-яўрэяў" (Націо, № 6, 1927 г. ст. 90). Мне здаецца, гэтыя прыклады напамінаюць кожнаму з нас недалёкія ямчэ часы царскай Расеі, і самі красамоўна гаворыць аб становішчы яўрэйскага жыхарства Польшчы.

Высьветлім, здаак, бок эканамічнага становішча яўрэйскага насельніцтва ў Польшчы. Падчас бюджэтнай дыскусіі ў польскім сойме ўвесну 1927 году прадстаўнік яўрэйскай фракцыі дэпутат Гартглес заначыў:

... „на яўрэйскае насельніцтва, ня гледзячы на тое, што яно ў большай частцы складаецца з беднякоў падае львіная доля падатковага цяжару... 12 проц. агульнага насельніцтва дзяржавы плацяць больш, чымся (50 проц.) палову ўсіх непасрэдных падаткаў".

А што дзяржава дае яўрэям?

„Яўрэі... на ўласныя культурныя патрэбы атрымоўваюць 0,8 проц. з той сумы, якая прадугледжана па бюджэту ў гэтай галіне... На адваго яўрэя прыпадае таксім чынам 3 грошы (0,75 або тры чвэрці капейкі), а на аднаго магомеданіна 1 злоты (25 к.)".

Кожны з нас добра ўяўляе сабе матар'яльнае становішча польскага яўрэя, бо гэта ёсьць родны брат нашага беларускага яўрэя. Вось, чаму для нас зразумелым павінна быць то, што нашы мерапрыёмствы па надзяленню яўрэяў зямлёй пранесьліся далёка за межы Саветаў, і што ўсюды, дзе жывуць яўрэі, пачаліся гутаркі аб аграрызацыі яўрэйства. Гэтым пытаньнем зацікавіліся ў сучасны момант яўрэйскія грамадзкія і палітычныя дзеячы Польшчы і Амэрыкі. Яўрэйская прэса Польшчы таксама вельмі жвава абгаварвае гэта пытаньне.

На падставе гэтага я хацеў-бы запытаць буржуазнага яўрэйскага дзеяча пана Дубнова—дзе сапраўды вырашаецца яўрэйскае пытаньне: ці там, дзе пануе буржуазея, ці там, дзе ўзмацнілася ўлада саветаў і дзе яўрэі: рабочыя, саматужнікі, рамесьнікі, земляробы, разам з усімі працоўнымі зьяўляюцца гаспадарамі і будаўнікамі новага жыцьця?

ПАЗЫКА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЯЛЯНСКАЕ ГАСПАДАРКІ ЎЗЬНІМЕ ДАБРАБЫТ ВЁСКІ.

Сьвядомая беднота паказвае прыклад.

БОЛЬШ УВАГІ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ УЗМАЦНЕНЬНЯ СЯЛЯНСКАЙ ГАСПАДАРКІ

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ ЧЫННА РЫХТУЕЦЦА ДА КАМПАНІІ.

На пасяджэньні Цэнтральнай Камісіі па рэалізацыі пазыкі, якое адбылося ўчора 24-га студзеня, быў заслуханы даклад прадстаўніка Наркамфіну т. Абрамсона аб тым, як рыхтуюцца ў нас да рэалізацыі.

Усяго для БССР вызначана рэалізаваць на 3.200 тыс. руб., гэтая сума разьмяркована па акругах наступным чынам: Менск —608 тысяч руб.' Бабруйск—512 тыс. руб., Магілеў—448 тыс. руб., Гомель—432 тыс. руб., Віцебск—384 тыс. руб., Ворша—368 тыс. руб., Мазыр—256 тыс. руб. і Полацак—192 тыс. руб.

Наркамфін БССР узьняў пытаньне перад Наркамфінам Саюзу аб тым, што часовыя квітанцыі перашкаджаюць пашырэньню пазыкі і трэба хутка выслаць для БССР аблігацыі, бо зараз выдаюцца часовыя квіткі.

Ужо атрымана невялікая колькасьць аблігацый, якія прызначаны для разьмеркаваньня паміж цякучага складу падпішчыкаў: для сялян, якія прыяжджаюць у горад па розных справах і г. д.

Акруговыя камісіі ва ўсіх акругах распачалі сваю працу. Але пакуль што слаба праводзіцца праца на райёнах.

Дзеля таго, каб аблігацыі хутчэй былі атрыманы на месцах, Наркамфін узбудзіў хадайніцтва аб непасрэдным праводзе аблігацый у райёны. З боку грамадзкіх арганізацый таксама назіраецца актыўная дапамога ў справе пашырэньня пазыкі, як ЦК сялянскіх к-таў дапамогі, крэдытная сыстэма, сельска-гаспадарчая і іншая.

У Бабруйскай акрузе нават Чырвоная армія ўзяла на сабе ініцыятыву пашырэньня сельска-гаспадарчае пазыкі. Спэцыяльна была наладжана лыжная вылазка за горад за 18-20 вёрст, дзе чырвонаармейцы і камаліткслад правялі сходы сялян.

У абмене думкамі па гэтаму дакладу выступіў цэлы шэраг таварышоў.

— Я лічу,—кажа т. Верас, што РВК павінны ўтварыць спаборніцтвы паміж с-саветамі. На маю думку, гэта павінна даць добрыя вынікі. Тав. Тафеенка кажа, што мясовы, так і акруговы друк, прычым матар'ял аб пазыцы трэба зьмяшчаць не на апошняй старонцы, а на першых двух старонках і больш буйным шрыфтам. Надзвычайна важную ролю ў гэтай кампаніі, кажа т. Палозьнін, павінны адыгрываць старшыні і сакратары сельсаветаў. Гэтыя людзі працуюць на месцы і ведаюць, як трэба падыходзіць да насельніцтва.

Тав. Хацкевіч адзначыў, што да гэтага часу цэнтральная камісія мала раскачалася; пакуль што камісія ня выдала дырэктыў па гэтым пытаньні.

Вакол пытаньня пазыкі трэба ўзварушыць грамадзкую думку. Але чамусьці наш друк аб гэтым амаль нічога ня піша. За гэтую справу трэба ўзяцца больш настойліва, трэба, каб газэты больш стала і дакладна высьвятлялі ўсе пытаньні, зьвязаныя з рэалізацыяй пазыкі. У гэтай кампаніі павінны прыняць чынны ўдзел усе нацыянальныя газэты Беларусі: яўрэйскія, польскія, літоўскія. Трэба паставіць кампанію пашырэньня пазыкі так, каб ніводзін селянін, ніводзін сялянскі двор не засталіся без пазыкі. Пры пашырэньні пазыкі трэба зьвярнуць галоўную ўвагу на аспоўныя пласты сялянства.

ШТО ПАСТАНАВІЛА ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ.

Камісія на сваім пасяджэньні пастанавіла:

Лічыць неабходным вывіць лепшыя сельсаветы ў справе пашырэньня пазыкі і праз друк паведамляць аб гэтым, а таксама выдаваць прэміі, запрапанавана акруговым камісіям вывучаць на мясцох, як выконваюцца дырэктывы па распаўсюджаньні пазыкі, прасіць Прэзыдыум ЦВК скарыстаць сялян-вылучэнцаў для правядзеньня гэтае кампаніі. Трэба выдаць дадатацыі газэтам „Акцябр" „Орка" і літоўскай газэце для дадатковага зьмешчэньня ў гэтых газэтах матар'ялу аб пазыцы.

Апроч таго, камісія даручыла т. Раманчуку пытаньне аб удзеле друку ў кампаніі паставіць перад адпаведнымі органамі, а таксама прасіць цэнтр, каб хутчэй былі высланы аблігацыі.

Што дае сялянам пазыка.

(Гутарка з прадстаўніком НКФ СССР).

Учора ў Менск з Масквы прыехалі прадстаўнікі валютнае ўправы НК Фінансаў СССР таварышы А. М. Абрамсон і Е. О. Фашанскі.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам яны паведамілі, што іх прыезд у БССР зьвязан з вытваранньнем досьледу праробленай працы ў галіне разьмяшчэньня пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі і з дачаю далейшых дырэктыў па акругах. У бліжэйшыя дні яны адведаюць усе акругі і шмат вёсак БССР.

— Па пазыцы ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі тыражы будуць рабіцца па райёнах, чаго ня было ў папярэдніх пазыках. Гэта значыць БССР, якая разьмесьціць 1—2 сэрыі (у кожнай сэрыі 2 з паловай міліёны руб.) у двох сваіх райёнах будзе рабіць два самастойныя тыражы.

У кожным тыражы будзе разыграна па аднаму выйгрышу ў 1000 руб., па 5 выйгрышаў у 500 руб., па 300—у 100 рублёў і па 1080—у 50 руб. кожны. Такім чынам, у БССР на кожную праданую сэрыю бясспрэчна прыпадае 1386 выйгрышаў на агульную суму—87500 руб. Такіх тыражоў у працягу году па кожнай сэрыі будзе два, а за ўвесь час—6.

АПРОЧ ТАГО, НК ФІНАНСАЎ УСТАНАВІЎ КОНКУРС НА ЛЕПШЫ РАЙВЫКАНКОМ З ВЫДАЧАЮ АДПАВЕДНЫХ ПРЭМІЙ. ПРЭМІІ БУДУЦЬ ВЫДАВАЦЦА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫМІ МАШЫНАМІ, ГРАШЫМА, ГАТУНКОВАЙ ЖЫВЁЛАЙ І ІНШ.

ЛЕПШЫМ БУДЗЕ ЛІЧЫЦЦА ТОЙ РАЙВЫКАНКОМ, ЯКІ ЗДОЛЕЕ ПАСТАВІЦЬ ПРАЦУ ПА ДАБРААХВОТНЫМ РАЗЬМЯШЧЭНЬНІ ПАЗЫКІ ТАК, ШТО РАЗЬМЕСЬЦІЦЬ НАЙБОЛЬШУЮ СУМУ, НАЙХУТЧЭЙ І АХОПІЦЬ НАЙБОЛЬШЫ ЛІК ДВАРОЎ.

Бярэце прыклад.

БАБРУЙСК. (Уласн. кар.). Рэалізацыя пазыкі ў в. Старая Рудня пачалася з 22 студзеня. Першымі падпісаліся на пазыку беднякі і серадняк: Мамошкін Міхась, Шалдыга Трахім, Раскін Язэп, Старасоцкая Маланьня, Сталяроў Кірыла, Крушнёў Сьцяпан, Чап'янаў Платон, Гваздова Агапа, Жукаў Пётра, Сталярова Ангіліна, Чап'янаў Савелі, Шалдыга Алеся, Старасоцкі Яфім, Войстрыкава Арына, Новікаў Павал, Жаброўская Марыля, Ясонаў Андрэй, Тарацялёў Мікіта, Дудзікаў Іван і Сьніцарава Дар'я.

Жлобінскі раён.

ПРАЦОЎНЫЯ ЯЎРЭІ АКТЫЎНЫЯ УДЗЕЛЬНІКІ БУДАЎНІЦТВА БССР.

Мы ўцягваем яўрэйскае насельніцтва ў саветы, каб кіраваць дзяржавай, мы ўтвараем яўрэйскія нац. саветы дзеля таго, каб праз гэтыя саветы ўцягнуць у дзяржаўнае кіраўніцтва самыя шырокія масы яўрэйскага насельніцтва.

Мы пераводзім яўрэяў на зямлю.

Наша праца ў галіне разьвіцьця яўрэйскай культуры, а таксам наогул у галіне культурнага абслугоўваньня яўрэяў за апошнія гады разьвярнулася надзвычайна шырока. Асобнае месца сярод мерапрыёмстваў па абслугоўваньні яўрэяў займае надзяленьне яўрэяў зямлёй. Гэта ёсьць адно з найважнейшых мерапрыёмстваў, накіраванае ў бок прыстасаваньня яўрэяў да вытворчае працы. Гэта задача не такая лёгкая. Яўрэю ў мінулым забаронена было займацца зямлёю. Ня толькі ў аколічнага насельніцтва, а часта ў самога яўрэя ёсьць недавер'е да сваіх сілаў, недаацэнка сваіх здольнасьцяй да земляробства. Нам трэба было перамагчы гэты псыхалёгічны момант, і мы перамаглі ўсе перашкоды і паступова пачалі рабіць новых яўрэяў, яўрэяў-земляробаў.

Некаторыя буржуазныя дзеячы вывучалі пытаньне яўрэйскага земляробства ў савецкіх рэспубліках і, ня маючы чаго сказаць, рабілі нам закіды, што надзвычайна мала яўрэяў-земляробаў. Праўда, іх мала, але тыя, якія ёсьць зьяўляюцца ў поўным сэнсе гэтага слова яўрэямі-земляробамі. Мы робім справу надзяленьня яўрэяў зямлёй не для палітыкі, а для карысьці працоўных. Гэта ня ёсьць Пацёмкінская вёска. Нашы яўрэі-земляробы ёсьць сапраўдна земляробы, якія ўжо завалавалі права працаваць, якія паказалі ўсяму сьвету здольнасьці яўрэя і якія пралажылі ўжо шлях да зямлі яўрэйскім масам, на гатоваму ўжо шляху будуць ісьці ў далейшым усё большыя і большыя масы яўрэйства, асядаючы на зямлю і прымаючы ўдзел у будаўніцтве нашай сацыялістычнай народнай гаспадаркі. (Гучныя воплескі).

Мы лічым, што насаджэньне яўрэяў на зямлю ёсьць адна з найважнейшых праблем у вырашэньні яўрэйскага пытаньня. Мы гэтай працы надаём надзвычайна вялікае значэньне. Вось чаму мы жадаем, каб нашыя першыя крокі ў гэтай працы былі ўдалымі, каб тут зрабіць магчыма менш памылак. Наша праца ў гэтым кірунку зацікавіла ўвесь сьвет. Асабліва многа надае ўвагі ёй яўрэйская грамадзкасьць заграніцай. Працоўныя яўрэі замежных краін з вялікім захапленьнем сачаць за нашай працай і нашымі дасягненьнямі. Яўрэйская буржуазея баічыць, што на падставе нашых мерапрыёмстваў яе апошнія ўплывы на яўрэйскія масы трацяцца, і яна хацела-б іх аднавіць. Гэтым тлумачыцца тое, што з аднаго боку, яўрэйская буржуазея робіць выгляд, што яна хоча дапамагчы аграрызацыі яўрэйства ў савецкіх рэспубліках, а з другога боку—усякімі спосабамі стараецца дыскрэдытаваць нашу працу.

У адказ на гэтыя адносіны яўрэйскай буржуазеі, мы гаворым так: Савецкі ўрад, паставіўшы перад сабою задачу аграрызацыі яўрэйства, будзе вырашаць гэта пытаньне незалежна ад таго, ці будзе нам дапамагаць яўрэйская буржуазея і яўрэйская грамадзкасьць капіталістычных краін, ці ня будзе.

Калі яўрэйская буржуазея шчыра хоча дапамагаць яўрэйскай беднаце, яна павінна зразумець усю важнасьць гэтай справы, павінна матар'яльна дапамагчы гэтай справе без усялякіх папярэдніх умоў і тады надзяленьне яўрэяў зямлёй пойдзе ўперад больш шпарка. Калі яна гэтага не зразумее, мы кланяцца ня будзем і ў справе надзяленьня яўрэяў замлёю будзем усё роўна ісьці ўперад (воплескі). Можа павольна, але няўхільна будзем ісьці наперад на гэтаму шляху (воплескі).

Кожны з нас цяпер добра на практыцы, на справе зразумеў, што такое савецкая ўлада, што нясе для працоўных савецкая ўлада. Кожны з нас на практыцы зразумеў, чаму трэба савецкую ўладу абараняць, чаму нам трэба берагчы саветы, як орган дыктатуры працоўных, як форму дзяржаўнасьці, праз якую мы зможам перайсьці да сацыялістычнага парадку жыцьця.

У канцы я хачу выказаць цьвёрдую надзею ў тым, што яўрэі-сяляне, якіх мы сёньня тут вітаем, якія прыехалі дзеля таго, каб абгаварыць бягучыя справы, пытаньні далейшага будаўніцтва сельскае гаспадаркі, будуць цьвёрдай апорай савецкай улады.

Нахай жыве яўрэй-селянін!

(Гучныя воплескі).

На эканамічныя тэмы.

Прыватны капітал.

I.

Пакуль у краі існуюць элемэнты прыватнае гаспадаркі, пакуль яны ня пыняюць падтрымліваць жыцьцё сыстэмы прыватнага звароту, пакуль апошні ня будзе поўчасьцю зьнішчаны, да таго часу інтарэсы эканамічнае палітыкі патрабуюць час ад часу ацэнкі дзейнасьці прыватнага капіталу з пункту гледжаньня: 1) эфэкту нашае эканамічнае барацьбы з ім, 2) тэндэнцый унутры сыстэмы прыватнага звароту і іх адпаведнасьці інтарэсам народна-гаспадарчага цэлага.

Унутры прыватнае гаспадаркі ў цэлым няўхільна павінны былі зьявіцца капіталістычныя храсткі. Аднак, ацэньваючы зараз пасьля 6-ці гадоў НЭП'у шлях разьвіцьця прыватнакапіталістычных тэндэнцый, прыходзіцца прызнаць, што яно далёка не дасягнула нават тых межаў, да якіх была падрыхтавана тады грамадзкая думка партыі, і ва ўсякім разе, не набыло пагражаючага, а тым больш рашаючага значэньня. Доля прыватнага капіталу ў прамысловасьці складае толькі пямногім больш 10 проц. прадукцыі, у сельскай гаспадарцы і, асабліва ў гандлі і на крэдытным рынку—трошкі больш, у транспарце—зусім нязначная. З усяе нацыянальнае маемасьці прыватнаму капіталу належыць толькі каля 6 пр., з штогадовага назапашваньня—трошкі больш (каля 14 проц.), але ўсе гэтыя храсткі капіталізму пачынаюць ужо адчуваць усё большы нажым моцнае дзяржаўнае гаспадаркі, здольнае паставіць на бліжэйшыя гады задачу іх поўнага пляннавага падначаленьня сабе.

Адным з найбольш характэрных рысе мінуўшага шасьцігодзьдзя зьяўляецца той факт, што храсткі капіталізму зьявіліся ня ў выніку канкурэнтнае перамогі над аднаведнымі галінамі дзяржаўнае гаспадаркі, а толькі там, дзе дзяржава не выступала канкурэнтам або сама знаходзіла мэтазгодным іх пасадзіць. Так, у прамысловасьці прыватны капітал арудуе на дробна-саматужных прадпрыёмствах, дзе дзяржава амаль наогул да апошняга часу ня выступала, і ў арандованых і канцэсыйных прадпрыёмствах, куды прыватны капітал спэцыяльна прыцягваўся. У гандлі прыватны капітал займае яшчэ не малыя пазіцыі толькі ў загатоўцы і збыце тавараў, якія не зьяўляюцца вырабамі дзяржаўнае прамысловасьці, тады як збыт апошніх пераважна (асабліва ў горадзе) знаходзіцца ў руках каапэрацыі і дзяржаўных органаў.

На крэдытным рынку капіталістычныя храсткі найбольш усяго выяўляюцца ў сельскай гаспадарцы, дзе дзяржаўны крэдыт знаходзіцца яшчэ ў пачатковых стадыях разьвіцьця. Наадварот, усюды, дзе дзяржава выступае канкурэнтам, прыватны капітал церпіць паражэньне, як гэта мы наглядаем у галіне хлебазагатовак, аптовым гандлі вырабамі дзяржаўнае прамысловасьці і часткаю зьвязаным з гэтым выціскані з раздробнага гандлю.

Прымушаны адступаць з вучасткаў, непасрэдна зьвязаных з дзяржаўнаю гаспадаркаю і яе рэгулюючым узьдзеяньнем, прыватны капітал спрабуе зьмяшыць магчымасьць гэтага рэгулюючага ўзьдзеяньня праз стварэньне ўласнага (бесперапыннага гаспадарчага ланцуга—капіталістычныя загатоўкі, фінансаваньне, перапрадоўка і збыт, часткаю нават транспарт (воды). Гэтыя спробы абапіраюцца ў аспоўным проста на скарыстаньне і частковае падначаленьне сабе простае таварнае вытворчасьці (сяляне, саматужнікі) паколькі яна ня была яшчэ досыць абслужана дзяржаваю. Паколькі такое абслугоўваньне будзе расьці, значыць спробы прыватнага капіталу стварыць для сябе намагчымасьці замкнёнае і загэтым слаба кантралюемае ўласнае кола назапашваньня, ня могуць быць ні пасьпешнымі, ні заціжнымі.

II.

Характэрнаю рысаю дзейнасьці прыватнага капіталу зараз зьяўляецца тое, што значная частка яго звароту працякае ў скрытых, замаскаваных або распылёных формах. Гэта абцяжарвае дзяржаўным рэгулюючым органам поўны абхват яго вучотам.

Тав. Ларын Ю. (гл. «Частный капитал в СССР» Дзяржвыд. РСФСР Масква 1927 г. і ў зборніку «10 лет советского строительства» выд. „Огонек") прыводзіць такія арыентовачныя лічбы разьмеру і апэрацый прыватнага капіталу ў СССР на 1-е кастрычніка 1927 г. Увесь прыватны крэдытны капітал па грашовым рынку (апроч сельскае гаспадаркі) складае прыблізна да 450 міліёнаў руб. Капітал сярэдняга і буйнага прыватнага гандлю трэба лічыць да 700 міліёнаў руб., а капіталістычнае прамысловасьці—да 450 міліёнаў руб. (уключаючы аспоўныя і зваротныя сродкі разам). Усяго прыватны капітал (бяз сельскае гаспадаркі) складае, такім парадкам, каля 1.600 міліёнаў руб. Звыш таго, у яго звароце (апроч сельскае гаспадаркі) знаходзіцца яшчэ да 400 міліёнаў руб. дзяржаўных крэдытных сродкаў: каля 350 млн. руб. у гандлі, загатоўках, будаўніцтве і лясной справе, і каля 50 млн. руб. у капіталістычнай прамысловасьці, транспарце і фондавых апэрацыях. У агульным, значыць, прыватны капітал у СССР апэрує зараз сваімі і дзяржаўнымі сродкамі прыблізна на 2 міліярды

ЗАГАТОЎКА ХЛЕБА І СЫРАВІНЫ.

У Віцебшчыне і Полаччыне ў загатоўках няма плянавасьці.

У ГОМЕЛЬШЧЫНЕ ЗА ПРАЦУ ЎЗЯЛІСЯ СУРЁЗНА.—МЕНШЧЫНА ПАЧЫНАЕ РАСКАЧВАЦЦА.

Тэмп працы трэба ўзмацніць.

(Гутарка з старшынёй праўленьня Белкаапсаюзу т. Наўлянскім).

Заданьне па збору паявых узносаў будзе выканана.

На аснове вестак з акруг можна сказаць, што апарат нізавой сеткі спажывецкай каапэрацыі яшчэ канчаткова не раскачаўся. Разам з тым усё-ж назіраецца пэўны зрух у працы нізоўкі ў лепшы бок. Гэты зрух дае надставу меркаваць, што заданьне па зборы паявога капіталу нашай спажывецкай каапэрацыяй будзе выканана ў тэрмін. Сутнасьць заданьня і яго разьмер ня выклікае ніякіх сумненьняў у мачымасьці іх выканаць. Калі-ж тое ці іншае заданьне застанецца нявыкананым, дык гэта можна будзе аднесьці выключна на расхлябанасьць і недысцыплінаванасьць апарату, што ўсё яшчэ мае месца.

Першыя пяноўныя весткі за дзесяць дзён (да 20 студзеня) даюць наступныя лічбы ў галіне збору паёў: Віцебскі саюз—па 37 таварыствах з 121 тысячы паступіла 13646 руб. ці 13 проц. заданьня; Днепрасаюз—12.000 руб. ці 10,9 проц.; Бабруйскі без Рагачова і Градзянкі—4283 руб. ці 6,6 проц., Менскае аддзяленьне БКС—11.900 руб., ці 14,1 проц.; Слуцкае аддзяленьне—5300 р., ці 15,3 проц. заданьня. Усяго-ж па пяноўных вестак сабрана 47296 руб. паёў. Трэба сказаць, што Гомельскі акрсаюз зусім не прадстаўляе ніякіх вестак, што зьяўляецца ненармальным і недапусьцімым, бо не дае магчымасьці своячасова ўлічваць пазасобныя слабыя месцы ў іх рабоце.

Вынікі загатовак за 10 дзён.

Паводле даных тых-жа саюзаў, за выключэньнем Днепрасаюзу і Гомельскага саюзу, за 10 дзён загатоўлена хлебных культур—945 тон, ільнянага семя 69 тон і скураной сыравіны на 19597 руб.

Што датычыцца загатовак другараднага віду сыравіны, то першыя весткі з месц гавораць аб тым, што ў гэтай галіне заўважаецца найбольшы зрух. За дзесяць дзён студзеня гэтай сыравіны загатована на 100352 руб. Праўда, хоць лічба гэта і значная, але яна можа быць значна павялічана, бо цэлы шэраг нізавых каапэрацыйных ачэек у гэтай рабоце яшчэ не раскачаліся. У прыватнасьці, у некаторых акругах (Ворша і Магілеў) нізавая сетка яшчэ не распачала працы па загатоўцы праз каапэрацыйных карабейнікаў, а між тым загатоўка праз апошніх другараднай экспортнай сыравіны можа даць найлепшыя вынікі.

Канчатковыя вывады аб зборы паёў і аб ходзе загатовак пакуль яшчэ рабіць заўчасна. Ясна толькі адно, што вынікі прызнаць здавальняючымі нельга; апарат раскачаўся слаба, і ў бліжэйшыя дзесяць дзён тэмп працы павінен быць абавязкова ўзмоцнен.

Загатоўкі ў Гомельшчыне ўзмацніліся.

ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ ІДУЦЬ ЗДАВАЛЬНЯЮЧА.

Загатоўка хлебных культур праходзіць здавальняюча, асабліва ў Хойніцкім, Брагінскім і Веткаўскім райёнах. Слаба праходзяць хлебазагатоўкі ў Хоймічах. У Засьпе, Рэчыцкага райёну, загатоўка ўзмацняецца. Грамадзкія арганізацыі памянёных райёнаў прымаюць актыўны ўдзел у загатоўчай кампаніі. «Хлебапрадуктам» з Брагінскага райёну адгружана ў Гомель 10 вагонаў зярна, з Хойнік адгружана 2 вагоны і чакаюць чаргі яшчэ некалькі вагонаў. Хойніцкім сельска-гаспадарчым таварыствам адгружана ў адрас Гомельскага «Хлебапрадукту» 5 тысяч пудоў зярна.

ЗАГАТОЎКА КАРОЎЯГА МАСЛА.

Сялянства Гомельшчыны вывозіць на рынак досыць значную колькасьць сьметанковага масла даволі высокай якасьці. Масла пападае выключна ў рукі прыватнікаў, якія вывозяць яго за межы гораду. Мясцовыя каапэрацыйныя арганізацыі не зьвярталі ўвагі на загатоўку масла ў той час, як наша гарадзкое насельніцтва адчувала патрэбу ў масьле. Акргандаль запранаваў каапэрацыйным арганізацыям распачаць скупку ад сялян кароўяга масла, якое вывозіцца на рынак.

АДПРАЎКА ЭКСПОРТНАЕ СЫРАВІНЫ Ў ЛЁНДАН.

Гомрайсаюз адсылае сёньня партыю экспортнае сыравіны ў Лёндан. Для прыняцьця сыравіны прыехаў спэцыяльны прыёмшчык з Цэнтрасаюзу.

«БЕЛАРУСКІ ЛАРОК» ЗАГАТОВІЎ ЗА ДВА ТЫДНІ 3.000 ПУД. ЗБОЖЖА.

Гандлёвая сетка працкалектыву «Беларускі Ларок» за апошнія два тыдні на мясцовым рынку загатовіў каля 3.000 пуд. розных збожжапрадуктаў на суму 5.000 руб.

РАЗЬВІЦЬЦЁ СМАЛАКУРАНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

Аб'яднаная Белкустпрамсаюзам смалакураная прамысловасьць БССР, складаецца з кустарных арцеляў па смалакурэньню. Усяго гэткіх арцеляў па БССР налічваецца 27 з агульным лікам катлоў у 50 шт.

Вясной прадугледжваецца далейшы рост кустарных смалакураных арцеляў. На разьвіцьцё іх ужо адпушчана да 35.000 рублёў. Прадукцыя арцеляў—доб ае якасьці—значная частка яе пойдзе для экспорту, бо яна мае попыт на замежных рынках.

У працягу I кварталу г. г. арцелямі выраблена шпігінару 250 тон, смалы 360 тон і галіната, які можа замяніць каніфоль—160 тон.

Усяго выраблена прадукцыі на суму 147.000 руб. Белкустпрамсаюз мае на ўвазе ў бягучым годзе экспартаваць за межы на 150.000 рублёў смалапрадуктаў.

Ня было кіраўніцтва— і вынікі дрэнныя.

(*Ад нашага віцебскага карэспандэнта*).

«КАНКРЭТНЫЯ» ДЫРЭКТЫВЫ Ў «СУСЬВЕТНЫМ» МАШТАБЕ І АМУРСКІ ТЫГР.

Кіраўніцтва нізавой сеткай сельска-гаспадарчай каапэрацыі з боку акрсельсаюзу Віцебшчыны і Полаччыны можна назваць слабым. К прыкладу, акрсаюз перадрукоўвае дыректыўныя лісты Белсельсаюзу і дасылае іх у нізоўку бяз усякіх тлумачэньняў, нават не прыстасоўвае іх да эканамічных умоў таго ці іншага райёну.

Быў і такі выпадак, калі ў свайм лісьце па нізоўцы Полацкі акрсаюз, замест канкрэтных указаньняў, як і што загатаўляць, на палых двох старонках перасылае сказамі ў „сусьветным» маштабе.

Ёсьць рэчы ячэ больш сьмешныя. Атрымаў Полацкі акрсаюз з Масквы ад жывёлавочта саюзу абежнік на 4-5 старонках з азначэньнем цэн на пушніну на замежным рынку. У гэтым абежніку можна знайсьці енісейскую вавёрку, алтайскую лісіну і амаль не амурскага тыгра, а пра беларускую пушніну—ні гуку.

І вось Полацкі акрсаюз перадрукоўвае гэты абежнік цалкам і рассылае па нізоўкам «для ведама і кіраўніцтва». Зразумела, што такіх абежнікаў нізавая сетка ня чытае і, урэшце, прывучаецца ня чытаць і таго, што трэба чытаць.

ЗАГАТОЎКІ НАСІЛІ ВЫПАДКОВЫ ХАРАКТАР.

За адсутнасьцю дакладнага кіраўніцтва і плянаў нізавая сетка сельска-гаспадарчай каапэрацыі адносілася да загатовак, як не да свае справы. Калі-ж на месцах што-небудзь і загатаўлялася, дык работа гэта была выпадковай—усё залежала ад ініцыятывы нізавых працаўнікоў.

У СЯМІ НЯНЕК ДЗІЦЯ БЕЗ ВАЧЭЙ.

Перазьбярыху ў працу па загатоўках уносіла таксама і падвойнае кіраўніцтва нізавой сельска гаспадарчай крэдытнай сеткай, якая зьяўляецца асноўным загатоўчым апаратам. К прыкладу, акрсельбанкі давалі на месцы ўказаньні, каб крэдытныя таварыствы вялі выключна крэдытную працу, а менш захапляліся загатоўкамі. Акрсельсаюзы-ж патрабавалі рабіць наадварот—вось тут і разьбярыся, якога начальства слухаць.

Вядомая рэч, такое становішча не магло не адбіцца на значэньні ўдзельнай вагі ў загатоўках сыстэмы сельска-гаспадарчай крэдытнай каапэрацыі.

БЛІЖЭЙ ДА СЕЛЯНІНА—І ВЫНІКІ ДОБРЫЯ.

Трэба адзначыць, што нізавыя працаўнікі праўленьняў сельска-гаспадарчай каапэрацыі в лімі рэдка выяжджалі ў вёскі, а загатаўлялі тое, што прывязе сам селянін.

Калі-ж цэнтральныя працаўнікі прымусілі старшыню Дрысенскага с.-гасп. крэдытнага т-ва выехаць па вёсках, дык ён за некалькі дзён загатовіў 700 пудоў, сабраў 600 руб. паявога капіталу і поўную суму пратэрмінованых пазык.

ЗАГАТОЎКІ ВЯДУЦЦА Ў БОЛЬШАСЬЦІ ПРАЗ Б. КУПЦОЎ І ІХ ПРЫКАЗЧЫКАЎ.

У загатоўчых арганізацыях спэцыялістымі на розным сыравіне ў большасьці выпадкаў зьяўляюцца былыя купцы, а ў лепшых выпадках—іх прыказчыкі. Вядомая рэч, чакаць ад іх патрэбнай нам работы ня прыходзіцца. Вось чаму мы бачым, што „спэцы" працуюць ня толькі на свае арганізацыі, але і на прыва нага гандляра. Неабходна будзе, каму належыць, падумаць аб тым, каб Віцебскі каапэрацыйны тэхнікум выпускаў ня толькі рахуннаводаў, але, галоўным чынам, рыхтаваў і вузкіх спэцыялістаў па загатоўцы прадуктаў сельскай гаспадарні і сыравіны.

ТРЭБА АТРЫМАЦЬ ЗАКАНТРАКТАВАНЫ ЛЁН.

Сельска-гаспадарчая каапэрацыя ў свой час правяла даволі значную працу па кантрактацыі лёну-валакна. Пакуль што здача гэтага валакна праходзіць вельмі слаба. Ёсьць райёны, у якіх паступленьне закантрактаванага лёну складае ўсяго толькі 17 проц. Але разам з тым, дзе кіраўнікі нізавых каапэрацыйных аб'яднаньняў займаюцца гэтым пытаньнем, задача лёну даходзіць да 40 проц. (Валынецкае с.-г. кр. т-ва). Паогул, выкананьне сялянамі сваіх дагавораў залежыць у большасьці ад той увагі, якая адводзіцца гэтай справе нізавой сеткай.

Можна прывесьці шэраг прыкладаў, што заможныя сяляне маюць вялікія запасы лёну-валакна (да 100 пуд. на гаспадарку) і ўсё-ж не здаюць яго па дагаворах, хоць і атрымалі ў свой час грашовыя авансы па кантрактах.

Нашым нізавым працаўнікам неабходна больш сур'ёзна і настойліва падыйсьці да сысканьня закантрактаванага лёну, не застанаўляючыся нават перад аддачай злосных „трымацеляў" пад суд.

З. Віцебскі.

Загатоўкі ў Меншчыне павялічваюцца.

Па 79 спажывецкіх таварыствах Меншчыны з 1-га да 20-га студзеня загатавана рознай сыравіны на суму 64361 руб., хлебных культур 22448 пудоў, 1512 пудоў ільнянага семя, 79 пудоў ільнавалакна і скураной сыравіны на 4946 руб. 82 кап.

Крайск, 25-1. Мясцовае спажывецкае таварыства за 20 дзён студзеня сабрала 56 руб. паявых узносаў, другараднай экспортнай сыравіны больш як на 260 руб. і скураной сыравіны на 150 руб.

Сьмілавічы, 25-1. За апошнія часы загатоўка збожжапрадуктаў пачынае ўзмацняцца. Так, за першыя дзьве дэкады студзеня мясцовае спажывецкае таварыства загавала розных хлебных культур 1950 пуд. Разам з тым таварыства праводзіць кампанію па зборы паявых выдоймак, якіх за гэты-ж тэрмін сабрана каля 540 руб.

Лагойск, 25-1. Лагойскае спажывецкае таварыства да 20-га студзеня загатовіла хлебных культур 714 пуд. і рознай сыравіны на суму каля 750 руб. Слабей стаіць справа са зборам паёў, якіх пакуль што сабрана ўсяго толькі 168 руб.

Зембін, 25-1. Наша спажывецкае таварыства яшчэ недастаткова разгарнула працу па сысканьні паёў. За час кампаніі сабрана ўсяго толькі 92 руб. што, зразумела, зьяўляецца невыстарчальным. Крыху лепш стаіць справа з хлебазагатоўкамі,—за дваццаць дзён студзеня таварыства загатовіла розных хлебных культур каля 600 пудоў.

Белдзяржсьпірт загатовіў 67000 пудоў збожжапрадуктаў.

За ўвесь час да 15 студзеня Белдзяржсьпірт загатовіў жыта і аўса 67000 пуд., з якіх 10000 пуд. загатовілі ў студзені гэтага году.

Хлебапрадукт прачнуўся.

За час з 1 ліпеня Хлебапрадукт праз свае пункты загатовіў усяго 60000 пуд. хлеба.

Пасьля прыняцьця шэрагу мер загатоўкі хлеба пачынаюць павялічвацца та; за першыя дзесяць дзён студзеня загатавана 5000 пуд., а з 10 да 19 студзеня—25500 пуд. Такім чынам, Хлебапрадукт за 19 дзён студзеня загатовіў палову таго, што было загатавана за шэсьць месяцаў да 1 студзеня.

Белхарчтрэст загатовіў за 1 з пал. месяцы 18000 пуд ячменю.

За паўтары месяцы Белхарчтрэст у райёне сваіх заводаў загатовіў 18000 пуд. ячменю. Асабліва ўзмацнілася загатоўка ў Магілеўшчыне, дзе за апошнія 2-3 тыдні загатавана 7000 пуд. ячменю. У Касьцюковічах за 3 дні загатавана 3000 пуд.

Жыцьцё і праца асьветніка.

Да 10-ае гадавіны Чырвонае арміі

23 лютага СССР сьвяткуе дзесятую гадавіну Чырвонае арміі.

Асьветнік ня можа стаяць у баку ад гэтага сьвяткаваньня, а павінен прыняць у ім самы актыўны ўдзел. У астатнія тыдні, якія засталіся да сьвята, трэба як належыць правесьці падрыхтоўку.

Падрыхтоўка да сьвяткаваньня і само сьвяткаваньне павінна прайсьці пад знакам умацаваньня сувязі асьветніцкай масы з Чырвонай арміяй, папулярызацыі гісторыі грамадзянскай вайны, тлумачэньня ролі УсеКП(б)—правадыра і арганізатара Чырвонай арміі і г. д.

Кожная культасьветная ўстанова павінна распрацаваць свой плян сьвяткаваньня, дзеля чаго трэба зьвязацца з камсамольскімі арганізацыямі і вайсковымі часткамі (там дзе, яны маюцца).

У парадак школьных заняткаў другога канцэнтру сямігодак трэба ўвесьці спэцыяльныя гадзіны для прапрацоўкі пытаньняў—Чырвоная армія на фронце грамадзянск. вайны і Чырвоная армія на варце СССР. Асабліва падкрэсьліць ролю Чырвонай арміі ва ўмовах БССР, як прымежнай рэспублікі.

Дзесяцігодзьдзе Чырвонае арміі ў школах трэба адзначыць арганізацыяй гуртка фізкультуры (да гэтага часу справа з фізкультурай у многіх школах стаіць вельмі дрэнна), ячэек Осоавіяхіму, гурткоў вайсковых ведаў і г. д.

Для азнаямленьня вучняў з жыцьцём чырвонаармейцаў пажадана ўтварыць шэраг экскурсій у казармы.

23 лютага асьветнікі павінны (там, дзе дазваляе магчымасьць) арганізаваць агульныя сходы з падшэфнымі часьцямі, даклады, вечары, выстаўкі ў дамох і кутках асьветы і г. д. Апроч таго, у дзень юбілею пажадана адчыніць у дамох і кутках асьветы вайсковыя куткі і габінэты, стралковыя ціры, санітарныя гурткі, гурткі вайсковых ведаў, выпусьціць спэцыяльныя нумары насьценных газэт і часопісаў, папоўніць бібліятэкі вайсковай літаратурай.

Апроч школы і асьветніцкай масы, у сьвяткаваньне трэба ўцягнуць і шырокія гушчы насельніцтва, шляхам агульных сялянскіх сходаў і пастаноўкі на іх адпаведных пытаньняў.

В. К.

Асьветнік і сялянская выйгрышная пазыка.

Зараз у нашым Савецкім Саюзе вельмі актуальным зьяўляецца пытаньне падняцьця нашай сельскай гаспадаркі, якая пакуль што адыгрывае дамінірую чую ролю ў нашай агульнай народнай гаспадарцы. Выпуск сялянскай выйгрышнай пазыкі мае на мэце ўзмацніць сялянскую гаспадарку шляхам правядзеньня цэлага шэрагу эканамічных мерапрыёмстваў. Для гэтага неабходны сродкі. Іх можа даць само сялянства з вялікаю карысьцю для сябе. Але гэта ня ўсе разумеюць. Магчыма будуць спробы сьвядомага зрыву падпіскі кулаком.

Неахвотна выпускаюць з рук рубель і сераднякі, нават на агульнакарысную справу. У некаторых мясцох псыхалёгія прыватніка-селяніна прымушае яго трымацца ў баку ад удзелу ў розных мерапрыёмствах. Часамі сяляне не падпісваюцца па інэртнасьці.

Непасрэдны абавязак кожнага асьветніка-настаўніка, загадчыка нардому, хаты-чытальні—растлумачыць насельніцтву сваёй вёскі ўсё надзвычайна вялікае значэньне правядзімай кампаніі пазыкі. Неабходна высьветліць усе выгады ад падпіскі, як для ўсіх працоўных мас нашага Саюзу, так і для кожнага падпішчыка ў прыватнасьці. Трэба выкрываць усякія спробы тармажэньня пазыкі, і разам з сельсаветам, мясцовымі ячэйкамі КПБ і ЛКСМ дабіцца поўнага ўсьведамленьня сялянамі сутнасьці пазыкі і значэньня найбольш выгоднага ўдзелу ў падпісцы. Для гэтай мэты неабходна выкарыстаць сходы, прыватныя гутаркі з сялянамі. У кожнай вёсцы неабходна з'арганізаваць спэцыяльную камісію, якая-б высьвятляла ўсе незразумелыя пытаньні, давала справукі і г. д.

Настаўніцтва павінна правесьці шырокую разьяснёльную кампанію і сярод вучняў старэйшых груп, якія часамі граюць значную ролю ў вырашэньні хатніх спраў. Ва ўсякім разе праз вучняў школы можна ў значнай меры папулярызаваць значэньне і карысьць пазыкі. Добра арганізаваная школа (асабліва сямігодка) змагла-б нават правесьці запіс падпішчыкаў, абыйшоўшы ўсе хаты. Разумеецца, пасьля правядзеньня належнае падрыхтоўкі.

Справе падпіскі неабходна ўдзяліць максімум увагі ў грамадзкай працы асьветнікаў на вёсцы, памятаючы, што ад посьпеху пазыкі ў значнай меры будзе залежаць тэмп пад'ёму нашай сельскай гаспадаркі, а ад пад'ёму сельскае гаспадаркі будзе залежаць разьвіцьцё і іншых галін народнае гаспадаркі, а разам з тым і пашырэньне культуры, дабрабыту працоўных мас нашага Саюзу.

Барысаў. В—ч.

Вялікая нагрузка перашкаджае працы.

Быў час, калі сумясьціцельства паасьвеце ўзаканялася за недахопам сіл і часовым характарам устаноў. Але цяпер апраўдаць гэтага «незамянімасьцю» немагчыма, бо цяпер шмат кваліфікаваных працаўнікоў чуць не беспрацоўных.

Часта назіраюцца факты, што працаўнікоў запрашаюць бяз ведама саюзу. Бываюць здарэньні, што працаўнік без папярэджэньня, бяз віны, звальняецца ці выцясьняецца і нават ў тых выпадках, калі працу яго лічаць добрай, асабліва ў тых установах, дзе аплата больш высокая. Такім чынам вызваляецца група працаўнікоў, якія працуюць у 6—7 установах і зарабляюць на 200—400 рублёў, а працаўнік такой-жа кваліфікацыі, і нават большай, вымушан здавальняцца чуць ня пятай часткай гэтага.

Вытворчасьць працы і кваліфікацыя ад сумясьціцельства паніжаюцца. Калі многія сумленныя працаўнікі апраўдалі дадзеныя ім авансам званьне выкладчыка вышэйшай ці павышанага тыпу школы, то толькі дзякуючы таму, што адмовіліся ад магчымасьці «подработать».

А таму ў мэтах павышэньня вытворчасьці, уцягненьня новых сіл і звышэньня беспрацоўя, саюз і наркамасьветы павінны прыняць меры да разгрузкі і мэтазгоднага выкарыстаньня сіл і ўдакладніць сыстэму найму і звальненьня.

Асьветнік.

Новыя стаўкі настаўнікам.

Канчаткова зацьверджаны наступныя стаўкі для настаўнікаў: у гарадох—I канцэнтр 44 руб. II канцэнтр—60 руб.; у райёнах у першым канцэнтры сямігодак і ўсіх прымітывах—42 руб., у другім канцэнтры райённых сямігодак—60 руб.

За загадваньне прымітывамі—1, 2 і 3-хкамплектнымі—2 руб., за загадваньне 4-хкамплектнымі школамі даецца надбаўка ў разьмеры 25 проц. стаўкі або 10 р. 50 к.

Вячэрнія школы моладзі, вяч. школы павышанага тыпу і сялянскай моладзі прыраўнёваюцца да другога канцэнтру сям годкі.

Новыя стаўкі ўводзяцца з 1 студзеня 1928 г.

Больш увагі апорным школам.

Падвышаць тэхніку працы трэба ня толькі тэарэтычна, але і практычна. У станка. Паказам. Указаньнем.

Дапамогі і ўказаньняў настаўніцтва чакае ад інспэктара ў сябе ў школе. І ад апорных школ, якія да гэтага году вельмі і вельмі мала зрабілі. Былі прычыны: 1) адсутнасьць ясна вызначаных функцый апорнае школы; 2) адсутнасьць належнай увагі з боку РВК і кіраўніцтва з боку інспэктуры і мэтадычных органаў; 3) ня зусім адпаведнае ўкамплектаваньне настаўніцкім складам; 4) частыя пераводы настаўнікаў гэтых школ; 5) адсутнасьць належнай матар'яльнай базы і слабая забясьпечанасьць настаўнікаў гэтых школ; 6) адсутнасьць папулярызацыі працы і практыкі гэтых школ.

Якія-ж задачы ставяцца перад апорнымі школамі і якія іх функцыі? Асноўнай задачай апорнае школы зьяўляецца сталая пастаноўка працы працоўнае (іменна працоўнае) школы па кампл. праграмах. Апорная школа—гэта школа, якая можа і павінна існаваць пры сучаснай нашай пэдагагічнай тэхніцы і дасягненьнях. Яна бярэ апраўданыя вывады дасьледчых школ і прывівае, умацоўвае гэтыя вывады ў масавых школах. Апорная школа—гэта ёсьць прапускное і перадатачна-рэкамэндацыйнае зьвяно паміж дасьледчымі і масавымі школамі розных тыпаў.

Сваёю стала пастаўленаю і абгрунтаванаю працай апорная школа папулярызуе новыя сыстэмы арганізацыі працы ў масавых школах, новыя праверяныя мэтады працы, найлепшыя формы сувязі з пасьлянцтвам і г. д. Апорная школа павінна стаяць на ўзроўні дасягненьняў школьнае практыкі сёнешняга дня і праз сваю працу знаёміць з гэтымі дасягненьнямі масавыя школы свайго райёну.

Апорная школа вывучае ў сваёй працы праграмы, падручнікі, мэтады працы, формы вучнёўскага самакіраваньня, адзначае недахопы, трудасьці, падсумоўвае практыку школ свайго райёну і ставіць для вырашэньня спрэчныя пытаньні перад мэтад. органамі і дасьледчай школай.

Апорныя школы павінны быць цесна зьвязаны ў сваёй працы з райён. мэтад. бюро і дасьледчай школай з аднаго боку і з школамі свайго райёну, з другога.

Апорнымі школамі павінны быць ня толькі 2-хкамплектныя, але абавязкова і аднакамплектныя, паколькі маюцца значныя асаблівасьці ў іх працы.

Апорныя школы павінны быць укамплектаваны лепшымі настаўнікамі, забясьпечаны неабходнымі дапаможнікамі, прыладамі. Інспэктура прымае самы актыўны ўдзел у працы гэтых, кіруе імі і праз апорныя школы праводзіць новыя праграмы і мэтады працы ў школы, якія для праграмна мэтадычнай працы аб'ядняюцца каля апорнае школы (ідэя пашыраных пэдсаветаў).

Апорныя школы (разам з пашыранымі пэдсаветамі) будуць вырашаць: 1) як найлепш праводзіць у жыцьцё новыя праграмы і ў якой меры яны пасільны для школы; 2) будуць складаць вучэбныя пляны (улічваючы мясцовыя ўмовы); 3) вывучаць і праводзіць новыя мэтады працы і навучаньня; 4) найлепшыя формы арганізацыі вучняў; 5) найлепшыя формы грамадзка-карыснай працы; 6) як лепш праводзіць чытаньне, пісьмо, лічэньне і г. д.; 7) абгаварваць дасягненьні і недахопы ў працы сваіх школ.

Апорным школам неабходна ўдзяліць максімум увагі як з боку інспэктуры, мэтбюро, так і з боку РВК.

В. Самцэвіч.

Пакуль вылечаць—памерці можна.

На ўсіх сходах вясковых асьветнікаў можна пачуць скаргі на цяжкасьці пры атрыманьні мэддапамогі ў горадзе. Каб напасьці на прыём к доктару ў рабочай амбулаторыі, трэба прыяжджаць не пазьней 7 гадзін раніцы. Чуць прыехаў пазьней—прыдзецца чакаць да вечара, а то і другога дня.

Нават і тады, калі своячасова пападзеш у амбулаторыю, усіх бед не пазбавішся. Атрымаў рацэпт, бяжыш у аптэку, а там—ізноў чакай чаргі. Часамі, каб атрымаць лякарства, трэба прачакаць цэлы дзень. Дзякуючы чарзе і ў амбулаторыі і ў аптэцы, прыходзіцца часамі патраціць два дні, а то і больш. Гэта дрэнна адбіваецца на школьных занятках.

Ужо ня раз уздымалася пытаньне аб тым, каб даць магчымасьць вясковым асьветнікам без чаргі атрымліваць мэддапамогу. Райстрахпункт ніяк ня можа згадзіцца з гэтым і заўсёды адмаўляецца.

Трэба, урэшце, каму належыць зьвярнуць увагу на гэтыя недарэчнасьці і пайсьці на спатканьне вясковаму асьветніку.

Слуцкі райён. П. А.

Аб літаратуры для вёскі.

XV партзьезд сказаў, што ўся палітыка пралетарскае дзяржавы накіравана на падтрыманьне ўсімі магчымымі мерамі бядняцкіх і серадняцкіх пластоў вёскі. Партыя прызнала бясспрэчным рост дабрабыту сярэдняга сялянства і сялянскай беднаты.

XV партзьезд прызнаў рост с.-г. прадукцыі, падняцьце актыўнасьці батрачаства і беднаты, ажыўленьне саветаў і рост каапэраваньня. Але, ставячы задачу ў вёсцы пагалоўнага каапэраваньня, Ленін казаў, што **«пагалоўнае каапэраваньне немагчыма бяз цэлай культурнай рэвалюцыі»**. Пытаньне культурнай рэвалюцыі, пытаньне культурнасьці, асабліва востра паўстае зараз, калі партыя рашуча ставіць пытаньні індустрыялізацыі краіны, стварэньне большай матар'яльнай забясьпечанасьці шырокіх мас.

Партыя зараз паставіла чарговым пытаньне культурнай рэвалюцыі. Тав. Кнорын у сваім артыкуле «За культурную рэвалюцыю» («Зьвязда» № 18) піша,—наш паўазіяцкі «культурны» узровень зьяўляецца перашкодаю для ўздыму нашай эканомікі, для стварэньня большай матар'яльнай забясьпечанасьці «шырокіх мас» і далей, пералічваючы задачы па культурнай рэвалюцыі, тав. Кнорын піша, што «задачамі на бліжэйшы пэрыяд зьяўляюцца задачы барацьбы за элемэнтарную пісьменнасьць, за элемэнтарную брашурку масам».

На гэтым пытаньні, асабліва на пытаньні аб брашурцы для вёскі, я зараз і хачу спыніцца.

Да гэтага часу ў нас існуе агульная формула:

а) што мы малы лік выдаём брашур для вёскі, а тым больш не выдаём харошых брашур;

б) што Белдзяржвыдат дрэнна выдае тэхнічна і

в) што на брашуры, якія мы выдаём, высокая цана і таму сяляне ня могуць іх купляць.

Ці ўсё гэта так? Не, ня зусім так.

Папершае, ня так трэба ставіць пытаньне, што мы мала выдаём, а што ў нас вясковая літаратура праступна мала распаўсюджваецца. Выдаваць мы можам і выдалі-б, вядома, ня толькі як мы выдаём зараз, а колькі нас запросяць. Выдаюцца надзвычайна каштоўныя брашуры, але, праўда, тыраж іх, на жаль, такі малы, што соромна прызнацца і гэта ня віна наша, а бяда.

Вазьму такія брашуры, выдадзеныя ў апошні пэрыяд Беларускім Дзяржаўным Выдавецтвам, як брашуры пад назвай: **«Як выгадаваць добрага каня»** А. Арлова; **«Капуста»** С. Каура; **«Угнаеньне кампостам і птушыным памётам»** С. Каур; **«Расказ аб паветры»** К. Паплаўскі і інш. Гэта надзвычайна каштоўныя брашуры, надзвычайна патрэбныя, навуковыя, простыя і зразумелыя для кожнага селяніна, а выдадзены яны кожныя ня больш, як у колькасьці па 3.000 паасобнікаў і гэта таму, што яны не распаўсюджваюцца. Так стаіць справа з найкаштоўнымі для селяніна і наогул сельскай гаспадаркі брашурамі. Брашуры, якія-б прынесьлі надзвычайна многа карысьці селяніну, ня чытаюцца. Тут перад намі важнейшая задача арганізаваць селяніна чытаць такія каштоўныя брашуры.

Падругое, Белдзяржвыдат выдае такія брашуры надзвычайна ўдала, чыста, скуратна, без памылак, добрыя, простая і зразумелая мова, спэцыяльна дапасаваны шрыфт, з удалымі ілюстрацыйнымі малюнкамі. Так стаіць справа з якасьцю выданьня.

Патрэцяе, цана гэтых брашур, намойму, ня толькі ня высокая, але ніжэй якой і быць ня можа, напрыклад: 8, 10, 12 капеек за брашуру; рэдка якая мае цану 15 кап. Гэта знача, што яе можна купляць за адно, два курыных яец. Так стаіць справа з цаной і магчымасьцю селяніну купіць.

Ясна, што пры адзначаным вышэй росьце дабрабыту вёскі нельга сказаць, што аб'ектыўныя матар'яльныя ўмовы сялян не дазваляюць купляць такое каштоўнае, таннае і неабходнае для іх літаратуры.

Нельга таксама сказаць, што няма каму ў сялянскай сям'і пачытаць, няма пісьменных, няпраўда і гэта. Зараз амаль што ў кожнай сялянскай гаспадарцы знойдзецца хоць адзін селянін, які ўмее чытаць, а іх у Беларусі 797700. Калі гэты лік гаспадарак параўнаць з тым, што не раскупляецца пара тысяч брашурак «Як выгадаваць добрага каня» і інш. цаною на 8 кап., то для кожнага стане зразумела, наколькі зьяўляецца важнай уся неабходнасьць культурнай рэвалюцыі ў вёсцы. Шырачайшыя пласты працоўных вёскі не карыстаюцца самай элемэнтарнай дапамогай ў сваёй барацьбе за лепшае матар'яльнае становішча, не карыстаюцца лепшымі брашуркамі, якія партыя і савецкая ўлада ўсямерна стараецца ім даць.

Падняцьце культурных запатрабаваньняў сялянства да карыстаньня брашурай, якая дапаможа зьнішчыць беднасьць і весьці гаспадарку больш рацыянальна і выгодна ў сучасны момант—ёсьць адна з шэрагу важнейшых задач арганізацый, вядучых працу ў вёсцы.

Пытаньне аб карыстаньні кніжкай у вёсцы трэба паставіць у першую чаргу перад вясковымі камуністамі, хамсамольцамі і вясковым актывам—яны павінны паказаць і даказаць прыкладам усім сялянам. Вырашэньне задачы прасоўваньня і карыстаньня кніжкай на вёсцы—ёсьць вырашэньне адной з задач культурнай рэвалюцыі пастаўленай XV партзьездам.

Ч. ВІЛЕНСТОВІЧ.

Рынак прамысловых тавараў у БССР.

(Паводле даных Белбюро савету сындыкатаў за сьнежань).

Тэкстыльны рынак.

У сьнежні наглядаўся павялічаны попыт на ўсе віды і гатункі тэкстыльных тавараў. Попыт выяўляўся як з боку гарадзкога, так і з боку вясковага спажыўца. Заўважаўся таксама вялікі попыт на гатовае адзеньне.

Гандаль тэкстыльнымі таварамі ў сьнежні меў характар пайковага разьмеркаваньня як ў каапэрацыі, так і ў дзяржаўнай розьніцы—на сяброўскіх кніжках і па талёнах.

Асабліва востра адчуваўся дэфіцыт суконна-шарсьцяных тавараў. Увесь тавар, што паступаў гуртам і ў розьніцы, заразжа раскупляўся незалежна ад гатунку і якасьці.

Незвычайны попыт быў на бавоўняныя тавары, а таксама на нітки, трыкатажныя вырабы, цёплую блізну і панчошны тавар усіх відаў.

Скураныя тавары.

У сувязі са значным завозам у сьнежні падашвы і раскрою, напружанае становішча на скураным рынку, якое мела месца ў лістападзе, ліквідавана амаль у поўнай меры. Гэта адразу адбілася на цэнах прыватнага рынку, якія зьнізіліся супроць цэн у лістападзе на 10-15 проц.

Назіраўся павялічаны попыт на хром. Попыт на падашву задаволен у наступных разьмерах: вытворчых арганізацый і прамысловай каапэрацыі—на 100 проц., а спажывецкай каапэрацыі—на 75 проц.; попыт на хром з боку вытворчых прадпрыёмстваў задаволен на 60 проц. і спажывецкай каапэрацыі—на 25 проц.

За сьнежань беларуская кантора Скурсындыкату рэалізавала тавараў на 1.017.638 руб.,—супроць прадугледжаных на плянку 440.000 руб., г. зн. перавысіла плян на 131 проц., а супроць рэалізацыі ў лістападзе—на 61 проц.

Завоз скураных тавараў у сьнежні быў таксама значна больш прадугледжанага на плянку і дасягнуў 950.450 руб.—Павялічэньне супроць намечанага плянам на 56 проц.

Мэталі і мэталёвыя вырабы.

На мэталі і мэталёвыя вырабы ў сьнежні быў яшчэ больш попыт, чым у лістападзе, пры яшчэ меншым задаволеньні гэтага попыту.

Незадаволеньне попыту на памянёныя тавары прымусіла спажыўцоў, галоўным чынам прамысловасьць і будаўніцтва, даставаць гэтыя тавары па-за межамі Беларусі, набываючы іх ужо са складаў.

Узмоцнены попыт выяўляўся на сартавое, дахавае і ацынкованае жалеза, бляху, балькі і цьвікі, самавары, прымусы і віды папярэчныя.

Узмацніўся попыт на ліставое жалеза ад 3 да 12 м-м, гаршкі чыгунныя і эмаляваныя малых разьмераў, тапоры і пажавы тавар.

Слабы попыт быў на чыгунныя чорныя гаршкі, лапаты, віды і падкоўныя цьвікі. Попыт на рэшту тавараў быў нармальны.

Сілікатны рынак.

У сьнежні, у сувязі з перадсьвяточным сэзонам, заўважвалася яшчэ большае ажыўленьне ў гандлі сілікатнымі таварамі, чым у лістападзе.

Асабліва ўзмоцнены попыт быў на фаянсавую пасуду, пры невыстарчальным яго задавальненьні. З прычыны таго, што попыт на фаянс ня быў задаволен, узрос попыт на фарфор. Попыт на сартавую шкляную пасуду быў сярэдні, прычым задаволен у поўнай меры.

Абарот аддзяленьня Продасілікату, лічачы і адгрузкі па генэральных дагаворах, дасягнуў у сьнежні 175.000 руб., што дае павялічэньне супроць лістапада на 33 проц. З паказанай

ЛЮТЫ

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
на 1 месяц . . . . . — 90 кап.
„ 2 „ . . . . . 1 р. 80 „
„ 3 „ . . . . . 2 р. 70 „
„ 6 „ . . . . . 4 р. — „
„ год . . . . . 8 р. — „

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“

ОРГАН Ц. В. К. Б. С. С. Р.

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА: у Менску—у канторы газэты, рог вуліц Ленінскай і К. Маркса, у правінцыі—упаўнаважанымі канторы і ўсімі паштова-тэлеграфнымі аддзяленьнямі і аддзяленьнямі Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
на 1 месяц . . . . . — 90 кап.
„ 2 „ . . . . . 1 р. 80 „
„ 3 „ . . . . . 2 р. 70 „
„ 6 „ . . . . . 4 р. — „
„ год . . . . . 8 р. — „

ЛЮТЫ

Год працы Беларускага Навукова-Дасьл. Інстытуту імя Леніна.

Сёньня спаўняецца першая гадавіна дзейнасьці НДІ Сельскае і Лясное Гаспадаркі імя Леніна.

Мінулы год быў багат арганізацыйнай працай, але яна не пашкодзіла выкананьню і ўсёй вытворча-дасьледчай праграмы НДІ.

Інстытут працаваў у складзе 3-х аддзелаў. Аддзел Лясной Гаспадаркі разгарнуў сваю дзейнасьць праз Цэнтральную Лясную Станцыю. Вывучалася 39 дасьледчых тэм па агульнай лесагадоўлі, 4 па лясной эканоміцы і 2 па лесаўпарадкаваньню. Значна разгарнуліся досьледы на лясной хімічнай тэхналёгіі, якімі непасрэдна кіраваў вядомы знаўца ў гэтай галіне праф. В. В. Шкацелаў. Інстытут пабудаваў спэцыяльную лясную Вэгэтацыйную хатку для больш складаных досьледаў па лесазнаўству. Станцыя апрабаваньня лясного насеньня пры аддзеле Лясной Гаспадаркі зрабіла дасьледваньне 137 абразкоў насеньня супроць 38 у леташнім годзе; насеньне прысылалася з розных лясьніцтваў Беларусі і суседняй Смаленшчыны.

Аддзел мэліярацыі і культуры балот расначаў досьледы па вывучэньню найбольш выгадных адлегласьняў між абсушальнымі канавамі і досьледы ўстойлівых магістраляў дзеля спуску вады. До ьледы зачапілі тэмы, якія маюць вельмі вялікае значэньне для практычных тэхнічных работ па мэліярацыі. Досьледы вяліся ў розных раёнах Беларусі пад кіраўніцтвам лепшага знаўцы мэліярацыі беларускіх балот праф. А. Д. Дубаха.

Менская Балотная Станцыя і надалей працягвала досьледы па культуры балот. Станцыя працуе 14 год. Яна мае ўжо паўныя навуковыя дасягненьні, якія сьведчаць аб выгадналасьці інтэнсыўнай балотнай культуры на Беларусі, аб магчымасьці мець на балотнай глебе ўраджаі ў 3-4 разы больш, чым сярэдніх беларускія ўраджаі на мінэральных глебах. Працы станцыі вяліся пераважна палявым мэтадам, цяпер станцыя шырока разгорне агра-хімічныя і аграфізічныя мэтады дасьледваньня. Пры бліжэйшым уделе праф. Дубаха і дырэктара Балотнае Станцыі М. В. Дакукіна НДІ заснаваў на Палесьсі (у Мар'іне) балотную дасьледчую базу, якая займецца дасьледваньнем найбольш выгадных мэтадаў культуры вялікіх палескіх балот.

Аддзел сельска-гаспадарчай эканоміі і аграрнай палітыкі за мінулы год правёў столькі эканамічных дасьледваньняў, колькі на было зроблена за ўвесь час у папярэднія гады. Праведзены экспэдыцыі па эканоміцы земляўпарадкаваньня, па эканоміцы мэліярацыі, па вывучэньню сельскае гаспадаркі Мазырскага Палесься, эканоміцы льнаводзтва, эканоміцы сьвінагадоўлі ва Слуцчыне. Распрацоўваюцца матар'ялы па эканамічнаму профілю БССР, па народнай гаспадарцы Заходняй Беларусі. Аддзел мае вязычайна багата першапачатковага дасьледчага матар'ялу па эканоміцы сельскае гаспадаркі БССР: звыш 14000 падворных апісаньняў сялянскіх гаспадарак, звыш 500 паселішчных манаграфій, больш 700 бюджэтаў сел. гаспадаркі.

Аддзел распачаў арганізацыю рахунковых запісаў у 68 сялянскіх гаспадарках; першая спроба завязденьня сялянскай бухгальтэрыі ўдалася,—звыш 50 сялян самі просяць завесьці ў іх запісы.

Перададзеныя Інстытуту Менская агранамічная і станцыя аховы расьлін працавалі на старой праграме. НДІ правёў пад кіраўніцтвам праф. М. К. Малюшыцкага і С. В. Скандракова працу на адшуканьню сталай паляводнай базы для Інстытуту і станцый; такой базай абароны—савецкія гаспадаркі Вялікая і Малая Сялішчынкі; ад перадачы гэтай базы Інстытуту будзе залежаць далейшы посьпех досьледу па расьлінагадоўлі.

НДІ аддаў вялікую ўвагу справе сувязі навукі і сельска-гаспадарчай вытворчасьці праз працу бюро сялян дасьледчыкаў; працы пададзена вядомая арганізацыйная форма; лік дасьледчыкаў-сялян узрос в 63 да 474. Для сялян праводзяцца завочныя дасьледчыя курсы.

Дзеля сувязі з агранаміяй выдаецца часопісь „Сельская і Лясная Гаспадарка“.

НДІ зьвязаўся з Інбелкультам як з вышэйшай навуковай установай БССР. Арганізавана супольна з ІБК Цэнтральная Хімічная Лябораторыя; супольна-ж вядзецца шэраг дасьледаў.

Цесную сувязь падтрымлівае НДІ з Беларус ай Акадэміяй Сельскай Гаспадаркі ў Горках.

У 1927-28 годзе НДІ арганізуе два новых аддзелы: расьлінагадоўлі і жывёлагадоўлі. Адчыняцца тры новых станцыі: цэнтральная бульбяная, чырвонага беларускага быдла і цэнтральная сьвінаводная; працы гэтых станцый НДІ надае асаблівае значэньне.

Мэтэорологічнае бюро, перададзенае НДІ Наркамземам, разгортваецца ў Беларускую Гэофізычную Службу,—з арганізацыяй у Менску Гэофізычнай Абсерваторыі; сёлета будзе прыдбана асноўнае абсталяваньне Абсерваторыі.

У складзе НДІ працуе 20 загадчыкаў устаноў і аддзелаў, з іх 11 прафэсароў і 4 дацэнты; 3 навуковых кіраўнікі, 10 вучоных спэцыялістаў, 17 асыстэнтаў, 24 аспіранты і 11 навуковых супрацоўнікаў,—а разам 85 навуковых працаўнікоў.

Бліжэйшай сваёй мэтай НДІ мае разгарнуць дасьледчую працу на тых спэцыяльных галінах гаспадаркі, якія яшчэ не абслужаны існуючымі дасьледчымі ўстановамі Беларусі.

Адшукаць спосабы павялічэньня вытворчасьці ў гэтых галінах, найшыбчэй правесьці гэтыя спосабы ў масы непасрэдных вытворцаў-сялян,—вось тое, чым НДІ імя Леніна дапаможа разьвіцьцю і сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі Беларусі.

Г. ГАРЭЦКІ.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Паступленьне падатку ўзмацнілася.

Гомель 25-1. Паступленьне сельска-гаспадарчага падатку ў акрузе ўзмацняецца. Першае месца на ходу паступленьняў займае Хойніцкі і Церахоўскі раёны. На 23 студзеня па памянёных раёнах паступіла 145 тысяч рублёў.

Адстаюць Гомельскі і Веткаўскі раёны. Засталося выканаць Гомельскаму раёну—43.598 руб., Церахоўскаму—22.842 р., Уваравіцкаму—43.349 руб., Чачэрскаму—16.663 руб.

Упаўнаважаныя акрфінаддзелу вывілі шэраг нядбайнасьцяў у працы па сысканьню сельска-гаспадарчага падатку. Старшыні некаторых сельсаветаў нядбайна адносіліся да сысканьня падатку. Яны адмаўляліся прымаць ад насельніцтва грошы на сел-гасп. падатку і адсылалі плацельшчыкаў падаткаў у Гомель. Памянёныя старшыні сельсаветаў прыцягваюцца да адказнасьці.

Належыць адзначыць, што шмат у якіх раёнах насельніцтва імкнецца зьліквідаваць сваю запазычанасьць.

Пасёлак Бярозкі Гомельскага раёну поўнасьцю ўнёс падатак на першаму і другому тэрміну. У в. Улукоўі толькі 10 гаспадарак не пакрылі сваю заназычанасьць другога тэрміну. Дрэнна праходзіць уплата сел.-гасп. падатку ў в. Раманавічы, Гомельскага раёну. Зроблена 40 опісаў маемасьці.

За нядбайныя адносіны да падатку—пад суд.

Магілеў. Справа выпаўненьня с.-г. падатку ў Лупалаўскім раёне дрэнна. Ня гледзячы на шэраг прынятых мер, с.-саветы яшчэ не раскачаліся.

Праверка працы ў Грабянеўскім с.-савеце ў галіне снягнаньня падатку паказала, што на 7 студзеня г. г. пасьля сканчэньня двух тэрмінаў у с.-савеце ёсьць яшчэ 192 плацельшчыкі на суму 1773 р. 95 к., з гэтай колькасьці 99 гаспадарак маюць 3 і больш галавы буйнай жывёлы.

С.-савет займае ў раёне адно з апошніх месц.

Прычынай гэтага—сам старшыня с.-савету Ныркоў Аляксандр не заплаціў у тэрмін падатку і нядбайна адносіўся да сваіх абавязкаў, ня прымаў ніякіх мер да снягнаньня ў 1 і 2-м тэрміне; у прэзыдыуме с.-савету неадчувалася яго кіраўніцтва і цэлымі тыднямі ён не зьяўляўся ў канцэлярыю с.-савету.

За такую працу старшыня с.-савету Ныркоў арыштаваў і ў хуткім часе стане перад судом, дзе атрымае кару па заслугам.

М. Р.

НОВАЯ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ ШКОЛА ПА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ І МАЛОЧНАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

Барысаў 25-1. Пры Варопецкім сельска-гаспадарчым тэхнікуме з 1-га лютага адчыняецца прафтэхнічная сельска-гаспадарчая школа жывёлагадоўлі і малочнай гаспадаркі Сваёй мэтай школа ставіць падрыхтоўку майстроў сыраваранья і масларобства. Курс школы разьлічаны на 3 гады; у школу будуць прымацца скончыўшыя чатырохгадовую пачатковую школу.

ПАЛЕПШАНЬНЕ СТАНОВІШЧА БАТРАЦТВА.

Бабруйск, 25-I. Акруговае аддзяленьне саюзу працаўнікоў зямлі і лесу заріз праводзе працу па арганізацыі сельбатрачкомаў з мэтай паляпшэньня абслугоўваньня батракоў і пастухоў у вёсцы. Ужо арганізаваны 22 батрачкомы.

Распачалася таксама праца па перазаключэньні і заключэньні новых дагавораў па батракоў, працуючых у сялянскіх гаспадарках. Летась дагаворамі было ахоплена 5195 батракоў і пастухоў.

Парушэньне бюджэтнай дысцыпліны.

Віцебск, 26-I. За мінулы бюджэтны год дзяржаўны фінансавы кантроль выкрыў шэраг парушэньняў па выдатках мясцовых сродкаў. Сума парушэньняў дасягае 83.806 руб. найбольшая сума з іх падае на камгас, які выдаў 53.644 рублі не па прызначэньню. Далей ідуць растраты—3500 руб. па тым-жа камгасу і па акрвыканкому, рэшта сумы—на няправільную выдачу заработнай платы і інш. Больш паловы сум, якія адносяцца да парушэньня бюджэтнай дысцыпліны, паступіла ўжо, рэшта паступіць бадай цалкам у працягу гэтага бюджэтнага году.

Буйны рост малочнай справы.

Малочны рынак у Віцебскай акрузе з году ў год буйна расьце. Напрыклад, у Любьвенскім раёне ў 1925 г. было 4 сыраварныя заводы, а ў 1927 г. іх ужо было 17. Масла ў 1925 г. выпрацавана 106 пудоў, а ў 1927 г. 1305 пуд.; сыру 350 п., а ў 1927 г.—2178 пуд. Прыблізна гэткі-ж рост назіраецца і ў іншых малочных кааператывах Віцебшчыны. Якасьць малочных прадуктаў, праўду сказаць, яшчэ нізкая, ад чаго збыт для с-г. таварыстваў не зьяўляецца рэнтабельным, а для паасобных гаспадарак ён усё-ж вельмі карысьцен.

Курсы для жанчын-сялянак.

Чэрвенскі райвыканком з 12-га студзеня праводзіць 10-цідзённыя раённыя курсы для сялянак—сяброў с-савету, дэлегатак і актывістак. Пры курсах існуе бібліятэчка з папулярных кніжак.

Курсы маюць на мэце ўзьняць палітычна-грамадзкую сьвядомасьць жанчыны-актывісткі. Тая зацікаўленасьць, з якой спаткалі гэтыя курсы жанчыны, павінна даць добрыя вынікі. Нявялікі лік курсантак тлумачыцца нездавальняючай падрыхтоўчай працай.

Чэрвень, Менск. акр. Сьцяпан.

Хроніка.

У Прэзыдыуме Менакрвыканкому.

Ліквідацыя выбарчых камісій.

У зьвязку з перанясеньнем перавыбараў саветаў на восень пастаноўлена ліквідаваць усе выбарчыя камісіі.

Пабудова лазьняў у вёсках.

Прэзыдыум АВК пастанавіў пабудаваць у кожным райёне округі на адной лазьні за рахунак сродкаў, адпушчаных па мясцовым бюджэту ў суме 3.750 руб. і дадатковага асыгнаваньня ад Чырвонага Крыжу 750 руб. Райвыканкомам запрапанавана тэрмінова вызначыць пункты пабудовы лазьняў.

Дарожнае будаўніцтва.

Зацьверджан плян дарожнага будаўніцтва на 1927-28 год. Згодна плану, на ўзмацненьне дарожнай гаспадаркі будзе расходавана 339.000 руб.

Сродкі на каапэраваньне інвалідаў.

Інспэкцыі Сацыяльнае Забясьпекі адпушчана 1000 руб. у лік пэнсіі інвалідаў на каапэраваньне іх.

Тав. Алейнікаў у Менску.

Учора ў Менск з Выдрыцы прыехаў галоўны інжанэр Асінастрою т. Алейнікаў.

Аб становішчы работ на Асінастрої т. Алейнікаў паведаміў наступнае:

— У сучасны момант поўным тэмпам ідуць работы па праводцы лініі перадачы на тарфяное балота і канчаецца абсталяваньне часовай электрастанцыі.

Канчаецца аднаўленьне і пабудова новых баракаў для рабочых у Выдрыцы.

Зроблены буйныя заказы „Лесбелу“ на матар'яльную драўніну. Ёсьць вялікі запас жалезных матар'ялаў.

У поўным ходзе падрыхтоўчыя работы да воснавого будаўнічага сэзону.

Галоўныя работы па будаўніцтву Асінастрою будуць рабіцца ў надыходзячы будаўнічы сэзон. Сёлета таксама мае быць зроблен значны запас торфу.

Прыезд у Менск тав. Чамярынскага.

З Масквы ў Менск прыехаў сэкратар яўрэйскай сэкцыі УсеКП(б) тав. Чамярынскі.

2-хмесячныя сельска-гаспадарчыя курсы для дарослых сялян.

У бягучым навучальным годзе арганізуюцца ў раёнах БССР 2-хмесячныя сельска-гаспадарчыя курсы для дарослых сялян, непасрэдна занятых на сельскай гаспадарцы. На ўтрыманьне гэтых курсаў адпушчана 47.000 руб. Кіраваць курсамі будуць спэцыялісты-аграномы і ветэрынарныя ўрачы.

Школа сельска-гаспадарчага вучнёўства.

15-га лютага Белсельтрэст адчыніе ў савецкай гаспадарцы „Жылічы“, Бабруйскай акругі, школу сельска-гаспадарчага вучнёўства для падростку, працуючых у якасьці броні ў савецкіх гаспадарках БССР. У школу будзе прынята 40-45 чал. Мэта курсаў—падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых для савецкіх гаспадарак.

120 ложкаў у ясьлях для бясспрытульных.

Цэнтральная Дзіцячая Камісія пры ЦВК БССР пастанавіла павялічыць у бягучым 1927-28 апрацыйным годзе існуючую сетку ложкаў у ясьлях для бясспрытульных яшчэ на 10. Усяго, такім чынам, на сродкі Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі ў 1927-28 годзе будзе ўтрымлівацца 120 пастаянных ложкаў у ясьлях для бясспрытульных.

Рэвалюцыйныя сьвяты і дні адпачынку па БССР.

Наркампрацы БССР устанавіў, пачынаючы з 1928 году, 14 дзён адпачынку, з іх рэвалюцыйных сьвят—7 дзён і асобныя дні адпачынку (рэлігійныя сьвяты)—7 дзён. Што датычыцца сьвяткаваньня рэлігійных сьвят, то адміністрацыя ў згодзе з фабзавмясцкомамі можа замяняць гэтыя дні іншымі днямі альбо кампансаваць іх павялічэньнем воднуску.

Нарады груп беднаты.

У перыяд з 19 лютага да 15 сакавіка па Менскай акрузе будуць праведзены раённыя нарады груп беднаты. Галоўная задача нарад—падрыхтоўка беднаты да вясенняй пасяўной кампаніі. На нарадах будуць абгаворваны таксама пытаньні хлебазагатоўчай кампаніі і распаўсюджаньня сялянскай пазыкі.

Акруговая канфэрэнцыя груп беднаты адбудзецца ў другой палове сакавіка.

Пашырэньне таварыстваў агнятрывалага будаўніцтва.

Зараз у Меншчыне існуе 18 таварыстваў агнятрывалага будаўніцтва. Сёлета акрэма мяркуе арганізаваць яшчэ 5 гэткіх т-ваў. Вытворчы плян прадугледжвае выпусьціць з заводаў таварыстваў 605.000 штук цэмантнай чарапіцы і 100.000 ганчарнай. Апрача гэтага, будзе выпрацавана 8000 пустацелых каменьняў, 4500 колькаў для студняў, 500.000 штук чырвонай і 5000 цэмантавае цэглы і 50 тон вапны.

Камянедрабільны завод.

У хуткім часе кіраўніцва працкалектыва ii заканчвае пабудову будынку для камянедрабільнага заводу. На гэтым заводзе таксама будуць выпрацоўвацца і жорнавы для млыноў. На заводзе знойдуць працу да 50 чалавек рабочых.

919 стажораў будзе разьмяркована па БССР.

Сёлета ў БССР канчаюць вышэйшыя навучальныя ўстановы і тэхнікумы, для якіх патрэбен гадавы стаж, 1.086 чал. З гэтай колькасьці па БССР будзе разьмяркована 919 чал., а на 167 чал. пасланы заяўкі ў саюзную камісію па практыцы і стажорству для прадастаўленьня ім месцаў ва ўстановах і прадпрыёмствах іншых рэспублік.

Яўка беспрацоўных на Менскай Біржы Працы.

Дэмабілізаваныя, якія знаходзяцца на вучоце сэкцыі чорнарабочых, павінны зьявіцца 31 студзеня ад 11-й да 12-й гадз. дня. Дэмабілізаваныя, што знаходзяцца на вучоце сэкцый вытворчае і разумовае працы і не зьявіліся 21 студзеня, павінны зьявіцца 28 студзеня на 9-ю гадз. раніцы.

Тыя, што ня зьявяцца, будуць зьняты з вучоту.

Пленум ЦСПСБ.

Учора вечарам у малой залі клюбу К. Маркса адчыніўся чарговы пленум Цэнтральнага Савету Прафсаюзаў Беларусі.

На парадку дню стаяць пытаньні: 1) рабочае кватэрнае будаўніцтва (дакладчык Карклін), 2) праца кас узаемаданамогі, 3) зацьверджаньне каштарысу ЦСПСБ на 1927-28 год, 4) даклад рэдакцыйна-выдавецкага аддзелу ЦСПСБ і 5) даклад рэдакцыі часопісі „Прафрух“.

На гэтым-жа пасяджэньні быў заслухан даклад т. Каркліна аб рабочым кватэрным будаўніцтве. Дакладная справаздача—у наступным нумары.

Насеньне да вясеньняй сяўбы.

На днях праз Управу Дзяржгандлю БССР прыбыло 4 вагоны насеньня канюшыны з Латвіі, 3 вагоны кармовых траў з Нямеччыны і 2 вагоны цімафеўкі і гародняга насеньня з Даніі. Атрыманая колькасьць насеньня дасьць магчымасьць забясьпечыць сельскія гаспадаркі ў вясеньнюю пасяўную кампанію.

Нашы тэхнікумы і краязнаўства.

Нядаўна ЦБ краязнаўства заслухала даклады аб тым, як разгортваецца краязнаўчая справа ў беларускім, яўрэйскім, польскім пэдтэхнікумах і гідротэхнікуме. Даклады выявілі, што студэнты апошніх курсаў прымаюць вельмі слабы ўдзел ў краязнаўчай справе, а таксама зусім ня прымае ўдзелу пэдфэрсанал (за выключэньнем яўрэйскага пэдтэхнікуму).

На пасяджэньні было пастаноўлена, што ў плян працы польпэдтэхнікуму трэба ўнесьці пытаньні агульнага краязнаўства, а ў плян працы гідратэхнікуму—наглядальні над рэжымам рэк і сьнегавых насьпілаў.

Падрыхтоўка спэцыялістаў па сельскай гаспадарцы.

Пры Варанецкім сельска-гаспадарчым тэхнікуме з 1-га лютага г.г. адчыняецца сельска-гаспадарчая школа для падрыхтоўкі спэцыялістаў па жывёлаводзтву, малочнай справе, сыраваральні і г. д. Тэрмін навучаньня ў школе—3-хгадовы.

У Віцебскай акрузе адчыняецца школа для вывучэньня культур лёну і маслабойнай справы.

У школы будуць прымацца вучні з агульнай адукацыяй ня ніжэй сямёхгодкі.

КІНО.

„Ухабы“.

(Кіно „Культура“.)

Фільма „Ухабы“—бязумоўна займае першае месца сярод нявялікай колькасьці карцін з рабочага жыцьця; гэта—добрая, бадзёрая, вельмі неабходная для рабочага гледача карціна. „Ухабы“ зьяўляецца значным дасягненьнем нашае маладое кінематаграфіі, і ў гэтым вялікая заслуга рэжысэра Роэма. У „Ухабах“ няма шаблёну, штампу; выведзеныя тыпы—жывыя людзі.

„Ціведаеце вы, як робіцца шкло?“ Вось просты, ясны і зразумелы для кожнага пачатак карціны. Адразу-ж перад гледачом паўстае маляўнак шкляной вытворчасьці, адной з самай цяжкай і шкодная для здароўя рабочага. Далей, таксама проста разгортваецца і паказана рэальны быт рабочых шклянога заводу.

Паўлюк, малады здаровы дзяцюк, рабочы заводу, ажаніўся на Тані, актыўнай камсамолцы, работніцы таго-ж заводу. Таня заняжарыла. Паўлюк нездаволен: дзіцё зьявіжа яму жыцьцё, ён хоча ад яго пазбавіцца, але Таня не згаджаецца. Таня працуе на заводзе, дагледае дзіцё, вядзе ўсю хатнюю гаспадарку, прымае ўдзел у грамадзкім жыцьці. У хаце не лады: Паўлюку абрыдла сямейнае жыцьцё, яму надаелі пялёнкі... Таню скарачаюць з заводу, як замужнюю. Паўлюк кідае жонку і сходзіцца з рысавальшчыцаю Лізай, але і з гэтай доўга ня жыве—кідае яе, а сам застаецца „на халастым становішчы“. За гэту справу ўзяліся грамадзкія арганізацыі, якія гутаркамі, пагрозамі, паказальным клюбным спэктаклям, дзе ролю пакінутае грае Таня, прымушаюць Паўлюка вярнуцца да Тані.

У карціне „Ухабы“ добрыя здымкі; вельмі прыгожа паказана акаляючая прырода; добра граюць акторы. Дзякуючы ўсяму гэтаму, карціна заслугоўвае ўвагі.

—скі.

„Варьетэ“.

(Кіно „Чырвоная Зорка“).

„Варьетэ“—пастаноўка вядомага нямецкага рэжысэра Эвальда Дзюпона. У „Варьетэ“ фактычна іграюць два сусьветныя акторы: Эміль Яніэнгс і Ліа-дэ-Путці, якія і вядуць асноўную дзею фільмы. Прагледзоўшы карціну, расчароўваешся: адразу відаць, што яе перакравалі і занадта разрэкламавалі. Усё-ж „Варьетэ“ па тэхніцы пастаноўкі зьяўляецца ўзорнай і толькі дзякуючы гэтаму можна згадзіцца з тым, што яна дэманструецца на савецкім экране.

Аднак, неабходна перасьцерагчы нашы кіно-арганізацыі ад перайманьня з „Варьетэ“ усяго цалкам. Што з карціны можна запазычыць? Толькі тэхніку пастаноўкі і ігру акторaў, але ня болей. Сапраўды, каго можа цікавіць сюжэт „Варьетэ“ (каханьне—роўнасьць—забойства), акрамя розбэшчанага капіталіста і іншых у яго рангу... Што можа даць „Варьетэ“ так званы „клясычны твор сусьветнага кіно-мастацтва“, для нямецкага рабочага? Нічога—яна яму непатрэбна.

Цяпер зьвернемся да рэклямы. Мы згаджаемся, што рэклама патрэбна і нават неабходна, але як кажуць: хвалі ды ня перахвальвай... Рэклама на „Варьетэ“ не адпавядае сапраўднасьці—яна шкодная, і ад гэтага трэба як найхутчэй пазбавіцца. Наколькі нам помніцца, наша савецкая фільма „Броненосец Потёмкин“, які мае куды большую вартасьць, але чамусьці яго гэтак не рэклямавалі. Няўжо гэта выпадковае зьявішча?

Нам здаецца, што фільм „Варьетэ“, ня гледзячы на гравыдзёную пастаноўку і добрую ігру актораў, нічога ня можа даць рабочаму гледачу—ёй яму не патрэбен, і яго ня трэба пускаць на клюбны экран.

Н—скі.

ЗАКОНЫ і ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену арт 4 пастановы ЦВК і СНК БССР „Аб рэгуляваньні продажу 40° хлебнага віна“.

Замест свае пастановы за 27 сакавіка 1926 г. „Аб рэгуляваньні продажу 40° хлебнага віна“ (З. З. БССР 1926 г., № 23, арт. 87) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць запісаць арт. 4 памянёнае пастановы ў наступнай рэдакцыі:

«Дазволіць прадаваць у гарадох адней асобе ня больш аднаго літру 40° хлебнага віна».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

19 студзеня 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об изменении ст. 4 постановления ЦИК и СНК БССР „О регулировании продажи 40° хлебного вина“.

Во изменение своего постановления от 27 марта 1926 г. „О регулировании продажи 40° хлебного вина“ (С. З. БССР 1926 г., № 23, ст. 87) Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют изложить Ст. 4 упомянутого постановления в следующей редакции:

"Разрешить продажу в городах одному лицу не больше одного литра 40° хлебного вина".

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

19 января 1928 г.
г. Минск.

Папраўка.

У пастанове Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, якая прынята на 2-й сэсіі VIII скліканьня, аб рацыяналізацыі савецкага апарату і аб задачах па яго ўзмацненьні, у пунктах 2 і 3 прапушчана слова „друк“.

Пункты 2 і 3 належыць чытаць:

2. Адзначыць значныя вынікі ў справе рацыяналізацыі савецкага апарату і пашырэньня праў мясцовых органаў улады, дасягнутыя пры актыўным удзеле ў гэтай рабоце, праз саветы, саюзы і друк шырокіх працоўных мас.

3. Абавязаць усе народныя камісарыяты, цэнтральныя ўстановы і акруговыя выканаўчыя камітэты прыняць належныя меры да ажыцьцяўленьня зацьвярджанага закону, а таксама намеціць далейшыя мерапрыёмствы па рацыяналізацыі дзяржаўнага апарату і палепшаньні яго працы шляхам шырокага прыцягненьня пра саветы, саюзы і друк да гэтай справы працоўных мас.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту ЦВК БССР А. Хацкевіч.

Здарэньні.

ЗАБОЙСТВА БАЦЬКІ.

Іван Заблоцкі з вёскі Сокарава (Полаччына) па грунце помсты забіў свайго бацьку Фядоса.

ЗАТРЫМАНЬНЕ РАСТРАТЧЫКАЎ

Крым. Вышук затрымаў судовага выканаўцу 3 вуч. Магілеўскай акругі Гушчынскага, які растраціў даручаныя яму грошы. Колькасьць растрачаных грошай дазнаньнем высьвятляецца.

ЗАТРЫМАНЬНЕ РАБАЎНІКА.

Магілеўскі Крым. Вышук на станцыі затрымаў А. Саўчэнка, якога шукае Крым. Вышук Армавірскае акругі. Саўчэнка абвінавачваецца ва ўзброеных нападах.

ЗГАРЭЎ ХУТАР.

Ад падпалу згарэў хутар грамадзяніна Памялушка (у Магілеўшчыне) са ўсімі будынкамі, інвэнтаром і жывёлай. Міліцыя затрымала гр-ку Сабалёву, якая на грунце зямельных спрэчак падпаліла гэты хутар.

Папраўка.

У прамове тав. Дайнэкі на 2-й сэсіі ЦВК УШ скліканьня па пытаньні аб «Сыстэме народнай асьветы ў Беларусі» ўкралася недакладнасьць. На старонцы 48 „дадатку да газ „Сав. Беларусь» № 13 (2201)“ надрукавана:

... «Сярэдняя навучальныя ўстановы як у РСФСР, так і на Украіне ёсьць. У РСФСР—9-цігодка, на Украіне—таксама“. Прамоўца гаварыў аб 9-цігодках у РСФСР з дзьюма апошнімі прафэсыянымі клясамі і аб 7-хгодзях на Украіне з прафшколамі над імі з 3-хгадовым курсам навучаньня.

Рознае.

ПОШТА ПАД ЗЯМЛЁЙ.

У Бэрліне дзеля перасылкі лістоў і іншай дробязі зроблена надземная пошта. Тут па трубах сьпёртым паветрам перасоўваюцца невялікія патроны з лістамі і тэлеграмамі.

У Лёндане зроблена яшчэ больш складная паштовая сетка пад зямлёй. Галоўныя вакзалы зьвязаны з лёнданскім паштамтам і яго аддзяленьнямі вялікімі падземнымі трубамі-тунэлямі, па якіх ходзяць электрычныя ваганеткі з поштай—да тоны (61 пуд) на кожнай ваганетцы. Рух адбываецца аўтаматычна. Нагрузка і разгрузка ваганетак робіцца амаль што цалкам мэханічнымі спосабамі—падъёмнікамі, канвэйерамі і г. д.

ПЛЯНЭРНЫЯ ПАЯЗДЫ.

У Нямеччыне былі зроблены вопыты буксіраваньня плянэра аэраплянам. Плёт цягнуўся на адлегласьці 200 кілёмэтраў. Вопыты з посьпехам былі паўторены некалькі разоў. У сувязі з гэтым, спэцыяльная камісія прызнала зусім ажыцьцявімай арганізацыю на невялікай адлегласьці рэгулярнага пасажырскага руху на плянэрах па буксірнай сыстэме. Ужо апрацоўваецца праэкт такога руху, пры чым мяркуецца пускаць цэлыя навады з некалькіх плянэраў. На кожным плянэры будзе шэсьць пасажыраў.

АЧЫСТКА СЬНЕГУ СОЛЬЛЮ.

У Амэрыцы пачалі практыкаваць апарат, які ачышчае вулицы ад сьнегу і лёду пасыпаючы іх сольлю. Апарат падвешваюць да грузавога аўтамабіля. У Амэрыцы ёсьць вялікія запасы солі і яна там зусім танная, а таму гэты спосаб значна эканомней, чымся «сьнежны плуг» і іншыя спосабы.

Апавяшчэньні.

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ ДЭЛЕГАЦКІ СХОД.

— Сёньня, 26 студзеня, а 7-й гадзіне ў клюбе Карла Маркса (вялікая заля) адбудзецца агульна-гарадзкі дэлегацкі сход, куды запрашаюцца дэлегаткі старога скліканьня, ячэйковыя жанарганізатары і актыў камуністак.

ПАВЕСТКА ДНЮ:

1) Даклад т. АРЦЮХІНАЙ (Заг. жан. аддз. ЦК УсеКП б чарговых задачах партыі і рабоце сярод жанчын, згодна пастаноў XV зьезду УсеКП(б).

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— У пятніцу, 27-I,—кіно „Человек з ливрее“. Сэансы ў 7 і 9 гадз.

Карціну саправаджае музыкальны дуэт.

ПЭДГАБІНЭТ.

— У пятніцу, 27-I а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца сход фізыка-матэматычнага гуртка.

Па парадку дню—даклад т. Пятосіна—„Элементы аналізу ў курсе элементарнай матэматыкі“.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

НОВАЯ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ ШКОЛА ПА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ І МАЛОЧНАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

Барысаў 25-1. Пры Варопецкім сельска-гаспадарчым тэхнікуме з 1-га лютага адчыняецца прафтэхнічная сельска-гаспадарчая школа жывёлагадоўлі і малочнай гаспадаркі Сваёй мэтай школа ставіць падрыхтоўку майстроў сыраваранья і масларобства. Курс школы разьлічаны на 3 гады; у школу будуць прымацца скончыўшыя чатырохгадовую пачатковую школу.

ПАЛЕПШАНЬНЕ СТАНОВІШЧА БАТРАЦТВА.

Бабруйск, 25-I. Акруговае аддзяленьне саюзу працаўнікоў зямлі і лесу заріз праводзе працу па арганізацыі сельбатрачкомаў з мэтай паляпшэньня абслугоўваньня батракоў і пастухоў у вёсцы. Ужо арганізаваны 22 батрачкомы.

Распачалася таксама праца па перазаключэньні і заключэньні новых дагавораў па батракоў, працуючых у сялянскіх гаспадарках. Летась дагаворамі было ахоплена 5195 батракоў і пастухоў.

Парушэньне бюджэтнай дысцыпліны.

Віцебск, 26-I. За мінулы бюджэтны год дзяржаўны фінансавы кантроль выкрыў шэраг парушэньняў па выдатках мясцовых сродкаў. Сума парушэньняў дасягае 83.806 руб. найбольшая сума з іх падае на камгас, які выдаў 53.644 рублі не па прызначэньню. Далей ідуць растраты—3500 руб. па тым-жа камгасу і па акрвыканкому, рэшта сумы—на няправільную выдачу заработнай платы і інш. Больш паловы сум, якія адносяцца да парушэньня бюджэтнай дысцыпліны, паступіла ўжо, рэшта паступіць бадай цалкам у працягу гэтага бюджэтнага году.

Буйны рост малочнай справы.

Малочны рынак у Віцебскай акрузе з году ў год буйна расьце. Напрыклад, у Любьвенскім раёне ў 1925 г. было 4 сыраварныя заводы, а ў 1927 г. іх ужо было 17. Масла ў 1925 г. выпрацавана 106 пудоў, а ў 1927 г. 1305 пуд.; сыру 350 п., а ў 1927 г.—2178 пуд. Прыблізна гэткі-ж рост назіраецца і ў іншых малочных кааператывах Віцебшчыны. Якасьць малочных прадуктаў, праўду сказаць, яшчэ нізкая, ад чаго збыт для с-г. таварыстваў не зьяўляецца рэнтабельным, а для паасобных гаспадарак ён усё-ж вельмі карысьцен.

Лекцыя тав. Матылёва ў Нядзельным Камвузе.

У нядзелю, 29 студзеня, у 11 гадз. раніцы ў вялікай залі клюбу імя Карла Маркса адбудзецца чарговая лекцыя ў Няд